ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ

# ДЗЕДЗІЧ

Для Бацькаўшчыны-маці буду йграць.
(Янка КУПАЛА)

№ 2 (14)
САКАВІК 2002

2 АДЗНАЧЫМ ДЗЕНЬ ПОМНІКАЎ! УСЕ НА КЛЯШТАР БЕРНАРДЗІНАК!

3 БЕЛАРУСІЗАЦЫЯ АДУКАЦЫІ. РЭАЛЬНАСЦЬ, ЦІ ПРАФАНАЦЫЯ?

4 КАЛІСЬЦІ ВІЛЬНЯ БЫЛА НАШАЙ СТАЛІЦАЙ. А ЗАРАЗ ЯНА – ЧУЖАЯ

5 ГІСТАРЫЧНЫ КАЛЯНДАР: САКАВІК – ЧАС АБУДЖЭННЯ



# СА СВЯТАМ ЦЯБЕ, БЕЛАРУСЬ!

## ШАНОЎНЫЯ БЕРАСЦЕЙЦЫ!

**Віншуем Вас з вялікім нацыянальным святам нашай краіны!**

*25 сакавіка Беларусь адзначае найважнейшае ў сваёй тысячагадовай гісторыі свята. У гэты дзень у 1918г. Рада Беларускай Народнай Рэспублікі прыняла 3-ю Устаўную грамату, у якой Беларусь абвяшчалася **"незалежнай і вольнай дзяржавай"**. Упершыню, пасля трох з паловай стагоддзяў панавання чужынцаў на нашай зямлі, беларусы заявілі на ўвесь свет аб тым, што яны жывуць і будуць жыць!*

*З таго дня мінула шмат гадоў, шмат пакут і выпрабаванняў выпала на долю беларускага народа, але ніхто ўжо не мог сказаць, што беларусаў няма! Ад гэтага часу ворагі беларушчыны вымушаны былі лічыцца з фактам існавання беларускага народа. Снуючы свае планы асіміляцыі, зліцця, інтэграцыі і г.д., яны мусілі асцерагацца, нават баяцца беларусаў.*

Дзякуючы гэтаму мы жывем зараз у суверэннай дзяржаве!

**Верым, што і сёння мы здольныя адстаяць незалежнасць краіны, каб мець будучыню – у свабоднай квітнеючай Беларусі.**

**ДА ЛЕПШАГА ЖЫЦЦЯ – ПРАЗ НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ!**

# ЁСЦЬ НАЦЫНАЛЬНЫ ГІМН!

10 САКАВІКА У МЕНСКУ ПРАЙШОЎ СХОД ГРАМАДСКАСЦІ, УДЗЕЛЬНІКІ ЯКОГА АБІРАЛІ ВАРЫЯНТ НАЦЫЯНАЛЬНАГА ГІМНУ БЕЛАРУСІ. ПЕРАВАЖНАЙ БОЛЬШАСЦЮ ГАЛАСОЎ НА ГІМН АБРАЛІ ПЕСНЮ «МАГУТНЫ БОЖА» НА СЛОВЫ НАТАЛЛІ АРСЕННЕВАЙ.

Менск, зала Саюза мастакоў. 10 сакавіка ў 12 гадзін тут адкрыўся Урачысты сход грамадскасці па прыняцці Нацыянальнага гімну Беларусі. На сход прыйшлі каля 130 прадстаўнікоў творчай інтэлігенцыі, сябры палітычных партый і грамадскіх арганізацый. Пісьменнікі і мастакі, кампазітары і дзеячы тэатра, навукоўцы і палітыкі, дэпутаты Вярхоўнага Савета 12 і 13 склікання на чале з М.Грыбам, якому выпаў гонар у 1994г. падпісаць Кастытуцыю Рэспублікі Беларусь, прадстаўнікі нацыянальных аб'яднанняў, моладзь… У прэзідыуме – знаны мастак А.Марачкін, старшыня Саюза пісьменнікаў В.Іпатава, кампазітар В.Войцік. На парадку дня адно пытанне – абмеркаванне і прыняцце нацыянальнага гімну Беларусі.

– У 1991 годзе парламент суверэннай Беларусі прыняў Герб і Сцяг нашай краіны, але мы да гэтага часу не маем сапраўднага Гімну, - сказаў А.Марачкін, адкрываючы сход. – Трыяда нацыянальных сімвалаў у нас не поўная. Таму сёння прапануецца абмеркаваць тыя варыянты, якія найчасцей называліся прэтэндэнтамі на гэтае высокае званне. Сярод іх – песні "Радзіма, мая дарагая" на словы А.Бачылы, "Пагоня" М.Багдановіча, "Мы выйдзем шчыльнымі радамі" М.Краўцова і "Магутны божа" Н.Арсенневай.

**(заканчэнне на с.2)**

## МАГУТНЫ БОЖА

Магутны Божа! Уладар сусветаў,
Вялікіх сонцаў і сэрц малых,
Над Беларусяй, ціхай і ветлай,
Рассып праменні свае хвалы.

Дай спор у працы, штодзённай, шэрай,
На хлеб штодзённы, на родны край.
Павагу, сілу і веліч веры
У нашу праўду, у прышласць дай.

Дай урадлівасць жытнёвым нівам,
Учынкам нашым пашлі ўмалот.
Зрабі свабоднай, зрабі шчаслівай
Краіну нашу і наш народ!

## АДНЫМ РАДКОМ

### ДЗЕЙНІЧАЕ МОЛАДЗЕВЫ ІНФАРМАЦЫЙНЫ ЦЭНТР

З кастрычніка 2001 г. на базе "Дзедзіча" дзейнічае моладзевы інфармацыйны цэнтр, які аказвае інфармацыйныя, кансультатыўныя, адукацыйныя і тэхнічныя паслугі моладзевым арганізацыям (МА) і ініцыятыўным групам Берасцейшчыны. Там можна атрымаць кансультацыі па рэгістрацыі МА, па вёрстцы газет і бюлетэняў; інфармацыю аб конкурсах праектаў, адукацыйных праграмах, у якіх могуць браць удзел прадстаўнікі МА, кантакты ўсіх МА і ініцыятыўных груп Берасцейскай вобласці. Ёсць магчымасць карыстацца кампутарам, прынтарам, сканерам, запісваць інфармацыю на CD, працаваць у Інтэрнэце. У Цэнтры праводзяцца працоўныя сустрэчы па актуальных праблемах дзейнасці МА.

**Dzedzich week-news**

### 18 КРАСАВІКА – ДЗЕНЬ ПОМНІКАЎ І МЯСЦІНАЎ



Вось ужо дваццаць гадоў большасць краін-удзельніц ЮНЕСКА адзначаюць 18 красавіка Міжнародны дзень помнікаў і мясцінаў. Ініцыятарам свята ў 1982 годзе выступіла Міжнародная Рада па помніках і мясцінах (ІКАМОС). Пазней гэтая прапанова была ўхвалена Генеральнай Асамблеяй ЮНЕСКА.

Сёлета ініцыятыўная група па стварэнні Беларускага камітэта Міжнароднай Рады па помніках і мясцінах прапануе адзначыць 18 красавіка пад дэвізам "Наша культура неадлучна ад нашай прыроды". Да ініцыятывы далучыўся шэраг грамадскіх аб'яднанняў - МГА "Гісторыка", ГА "ЭКАДОМ", а таксама грамадскія ініцыятывы "Косаўскаму палацу – жыць!" і моладзевая ініцыятыва "Побач".

З нагоды свята "Дзедзіч" сумесна з берасцейскай філіяй МГА "Гісторыка" вырашылі правесці акцыю па ачыстцы кляштара бернардзінак – самага старога з захаваўшыхся будынкаў Берасця, які знаходзіцца на Шпітальнай выспе (тэрыторыя Брэцкай крэпасці). Яе мяркуецца правесці ў нядзелю, 14 красавіка. У падвалах і пакоях кляштара, а таксама вакол яго плануецца прыбраць смецце, спілаваць дрэвы, што растуць нават на даху.

Усіх, каму не абыякавая нашая спадчына, арганізатары запрашаюць далучыцца да ўдзелу ў акцыі. Кантактныя тэлефоны: (0162) 20-42-45 (Дзмітрый Шыманскі), 42-67-47 (Наста Ільіна).

**Dzedzich week-news**

**ШАНОЎНЫЯ СЯБРЫ!**
**Рэдакцыя "ДЗЕДЗІЧА"**
**з задавальненнем прыме ад Вас бясплатныя прыватныя аб'явы ў наступны нумар бюлетэня, які пабачыць свет у сярэдзіне красавіка 2002 г.**
**Звяртайцеся па тэл.: (0162) 26-15-51 да 05.04.02.**

# ТУТЭЙШЫЯ

ЧАСАМІ МНЕ ЗДАЕЦЦА, ШТО НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АДМЕТНАСЦЮ БЕЛАРУСКАГА САМАПАЧУЦЦЯ З'ЯЎЛЯЕЦЦА НЕ РАХМАНАСЦЬ, НЕ ПРАЦАВІТАСЦЬ І НАВАТ НЕ ГАСЦІННАСЦЬ, А ТУТЭЙШАСЦЬ.

***– Каго любіш?***
***– Люблю Беларусь!***
***– То ўзаемна.***
**Пароль паўстанцаў К.Каліноўскага**

Вось яна, нацыянальная трагедыя беларусаў. Гэткая бязмежная цярплівасць-абыякавасць да асабістага лёсу. Цярплівасць, якая непрыкметна ператвараецца ў рабскую пакору. І карысліва-эгаістычнае, бязмэтнае існаванне пад назвай жыццё. Ідэі? Прынцыпы? Аб чым вы кажаце!? Усё вырашыцца за нас.

Пакланяемся чужым ідалам і багам. А "тутэйшых" не ведаем. Вось вам яскравы прыклад. Беларускі горад Кобрын. Галоўная славутасць, адно з самых папулярных месцаў моладзевых тусовак, – музей вялікага палкаводца Аляксандра Суворава. Вуліца ў яго гонар, тут жа помнік герою – усё як трэба, у лепшых традыцыях. Геніяльна. Хто такі Тадэвуш Касцюшка – не ведаем. У лепшым выпадку блытаем з Кастусём Каліноўскім. А павінны былі б ведаць, што Касцюшка – наш славуты зямляк і герой. Тысячы беларускіх сялян пад яго кіраўніцтвам змагаліся і зложылі галовы ў барацьбе з войскамі Суворава. За што змагаліся? За нацыянальную незалежнасць. За сваю і нашу свабоду. А propo: ніводнага музея Касцюшкі на Беларусі няма.

Гістарычны герб і сцяг затапталі. Самі. Дзякуючы Вялікаму Ініцыятару ўсіх часоў і народаў. А тое, што пад гэтым сцягам у XVI ст. баранілі межы, хадзілі на Маскву і перамагалі? Так, 400-гадовая гісторыя, пакрытая пылам. Сабраліся, змянілі сімволіку, разышліся. А з нас весела пасмяяўся ўвесь свет.

Праяўленне нацыянальнай свядомасці і сапраўднага патрыятызму расцэньваецца сёння як нацыяналізм. Свядомы француз, між тым, ніколі не набудзе сваёй дачцэ ў краме амерыканскую ляльку Barbie, нават калі яна зроблена ў Францыі. Бо ідэя – амерыканская. Праяўленне нацыяналізму? А на мой погляд – сапраўдны патрыятызм.

Мову амаль задушылі. Не ведаем, што сябе душым. "Шмат было такіх народаў, што страцілі найперш мову сваю," – святыя словы нашага прарока, сялянскага адваката Францішка Багушэвіча.

І нічым не выбіць, не вытрасці з нас гэтую тутэйшасць. Пытаюся ў моладзі:

– Каго з беларускіх байкапісцаў ведаеце?
– Крылова, безумоўна.
– А Крапіва?
– Якая крапіва?

...Часамі мне здаецца, што мы паміраем. Ад тутэйшасці...

**Алена МАЁВАЯ**

# ЁСЦЬ НАЦЫНАЛЬНЫ ГІМН!

**(Заканчэнне. Пачатак на с.1)**

У кожнага з гэтых твораў ёсць свая гісторыя, свае прыхільнікі, але гімнам можа быць толькі адзін з іх. І мы мусім зрабіць свой выбар на карысць таго, які будзе прыняты большасцю беларускага народа, дапаможа нам аб'яднацца і годна прадстаўляць Беларусь у свеце.

На трыбуне народны паэт Беларусі Н.Гілевіч, які ў свой час ўзначальваў камісію Вярхоўнага Савета па стварэнні новага гімну:

– Я глыбока перакананы, што ніводзін конкурс на стварэнне гімну не можа даць станоўчага выніку. У тым ліку і той, які абвешчаны нядаўна. Гімны не ствараюцца да нейкай даты. Гімн – гэта любімая ў народзе песня, якая выяўляе найбольш істотнае ў народзе, яго памкненні. Мы перабралі дзесяткі варыянтаў і ў выніку пагадзіліся, што лепшы з іх - "Магутны божа". Але да прыняцця рашэння справа не дайшла – сённяшняя ўлада ўзяла курс на рэванш, на вяртанне савецкіх, крыху зарэтушыраваных сімвалаў. Што нам рабіць? Калі мы пагадзімся, што гэты твор варты стаць нацыянальным гімнам, - яго трэба прымаць і ўсемагчымымі сродкамі прапагандаваць, друкаваць, спяваць – ён павінен жыць.

З ім пагаджаецца кампазітар В.Войцік:

- "Магутны Божа" – малітва, якая нясе надзею. Яна патрабуе аранжыроўкі гімнавай, павінна гучаць больш сцвярджальна і энергічна. У ёй ёсць класічная традыцыя і беларускасць.

Інакш глядзіць В.Іпатава:

- Дрэнна мы жывём, усе прыгнечаныя, няма радасці. Нам трэба адчуць вышыні, патрэбна нязломнасць і ўпэўненасць. Гэтаму адпавядае "Пагоня" М.Багдановіча. Беларус павінен адчуць сябе годна.

- Мы павінны перш за ўсё заставацца беларусамі, у кожнай справе набліжацца да вечнага, - сказаў Г.Бураўкін. – Мы не ведаем, каму сёння даручана ўладамі абіраць нам гімн. Але не выключана, што яны могуць пайсці па бяздарнаму савецкаму шляху: да савецкай мелодыі прыстасуюць нейкія новыя словы. І будзе чарговы здзек над душою. Што мы можам прадставіць гэтаму авантурызму? З усіх прэтэндэнтаў на першым месцы – "Магутны божа". І я галасую за яго.

Адзін за другім бралі слова мастакі М.Купава і У.Басалыга, праваабаронца В.Стрымкоўская, партыйныя і моладзевыя лідэры В.Вячорка, П.Знавец, П.Севярынец і іншыя. Гучалі розныя прапановы, развагі, перасцярогі: ці не будзе ўспрымацца "Магутны божа" як хрысціянская малітва? І вельмі пераканаўча прагучаў на яго адказ прадстаўніцы згуртавання беларускіх татар Разаліі Александровіч. У кожнага народа, сказала яна, можа быць свой Бог, ён можа называцца па рознаму, але ён ёсць і чалавек можа звяртацца да яго.

Калі ў час праслухоўвання прапанаваных твораў загучала ўзнёслая мелодыя "Магутны Божа" зала ўзнялася і слухала стоячы. Стала зразумела, што ёсць адзінства і гэта падцвердзіла рэйтынгавае галасаванне. Песня "Магутны Божа" – словы Наталлі Арсенневай, музыка Міколы Равенскага, абрана Нацыянальным гімнам Беларусі.

Што далей? Рашэнне сходу будзе даведзена камісіі па стварэнню дзяржаўнага Гімна Рэспублікі Беларусь. Але не гледзячы на вынікі, мы ведаем – у нас ёсць Гімн і ён пачаў сваё жыццё дзесяцігоддзі таму і будзе жыць вечна, будзе гучаць на сходах і мітынгах.

**Рыгор БАКІЕВІЧ, удзельнік сходу.**

# БЕЛАРУСІЗАЦЫЯ?

## МОВА, ЧЫНОЎНІКІ І АДУКАЦЫЯ: «РАСПРАЦАВАЦЬ», «ПАШЫРЫЦЬ»...

ЛЕТАСЬ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ ПРЫНЯЛО ПАСТАНОВУ, ЯКОЮ ЗБІРАЕЦЦА ПАШЫРЫЦЬ СЕТКУ ШКОЛ, ЛІЦЭЯЎ З ВЫКЛАДАННЕМ НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ. КАЛІ ЧЫНОЎНІКІ НЕ ЗАЎПАРЦЯЦЦА, ГЭТА МОЖА СТАЦЬ ПЕРШЫМ КРОКАМ У ЧАРГОВАЙ СПРОБЕ ПЕРАВОДУ СІСТЭМЫ АДУКАЦЫІ НА БЕЛАРУСКУЮ МОВУ. А МОЖА І НЕ СТАЦЬ...


Ці будзе гэты хлопчык хадзіць у беларускамоўную школу? А ў ВНУ?
Фота: IREX/ProMedia

Беларуская мова і яе месца ў сістэме адукацыі - гэтыя праблемы турбуюць грамадства не адзін дзясятак гадоў. Рэальную магчымасць атрымліваць адукацыю на роднай мове беларусы атрымалі, як ні дзіўна, у Першую Сусветную вайну, за часоў нямецкай акупацыі. Менавіта немцы першымі дазволілі ўжываць беларускую мову ў адукацыйнай сферы, а зусім не бальшавікі, як нават дагэтуль сцвярджаюць школьныя падручнікі. Наадварот, пры саветах, пачынаючы з 1930-х гадоў, беларуская мова паступова страчвае свае пазіцыі ва ўсіх сферах жыцця грамадства. У 1958 годзе ў Менску з 58 школаў беларускамоўнымі былі толькі 10. У 1960-70-я гады пашырылася практыка «вызвалення» школьнікаў ад вывучэння беларускай мовы. У 1972/1973 навучальным годзе ў расейскамоўных школах навучаліся амаль 52% школьнікаў рэспублікі, прычым у гарадах - пад 98%.

У 1980-я гады агульны стан беларускай мовы навукоўцы ацэньвалі як «катастрафічны». Пасля надышла пара чарговай «беларусізацыі», пра якую сёння засталіся адно настальгічныя ўспаміны...

Поўнай нечаканасцю стала для ўсіх прыняццё Міністэрствам адукацыі «Праграмы дадатковых захадаў на пашырэнне сферы выкарыстання беларускай мовы ў сістэме адукацыі» - так афіцыйна завецца гэты дакумент. Праграма, на жаль, не была апублікаваная ў СМІ. Гэта - унутраны міністэрскі акт. Таму мы ўважаем за патрэбнае назваць такія-сякія пункты Праграмы. Такім чынам, Міністэрства адукацыі плануе:

- пашырыць сетку школ, гімназіяў, ліцэяў з арганізацыяй навучальна-выхаваўчага працэсу на беларускай мове;
- паступова перавесці на беларускую мову візуальную інфармацыю ў навучальна-выхаваўчых установах;
- пашырыць вядзенне справаводства на беларускай мове;
- пашырыць сетку дзіцячых дашкольных установаў з беларускай мовай выхавання ў гарадах;
- распрацаваць перспектыўны план адкрыцця беларускамоўных плыняў у гуманітарных, тэхнічных, вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах;
- адкрыць у вышэйшых навучальных і сярэдніх спецыяльных установах навучальныя групы, аддзяленні з беларускай мовай навучання.

Вышэй пералічаныя пункты - далёка не ўсе. Найважнейшая і найбольш рэальная ў плане іх ажыццяўлення пункты тычацца стварэння беларускамоўных плыняў у ВНУ. Між іншым, парламент прыняў пастанову забяспечыць абавязковае здаванне пры ўступных экзаменах у ВНУ дзвюх дзяржаўных і адной замежнай мовы. Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў падтрымалі прапанову дазволіць ствараць у ВНУ беларускамоўныя плыні.

Вось што мяркуюць на гэты конт дэпутат Палаты прадстаўнікоў Іван Пашкевіч і намесніца старшыні Таварыства Беларускай Мовы Людміла Дзіцэвіч.

**І.П.:** - Мы ўзаконілі, што сёння чалавек павінен здаваць тры экзамены - беларускую, расейскую і адну замежную мову. Цяпер гэтыя палажэнні закону трэба ставіць на кантроль перад Міністэрствам адукацыі, каб яно распрацавала адпаведныя захады.

**Л.Д.:** - Гэта, вядома ж, добра - абавязковыя экзамены па беларускай, па расейскай і ангельскай мовах. Гэта паказчык таго, што мы выходзім за межы білінгвізму, а ён нам ужо надакучыў, бо сапраўднага білінгвізму ў нас няма і не было. І таму, калі пытанне пастаўленае гэтак, дык полілінгвізм - гэта, відаць, найлепшая сітуацыя для Беларусі.

**І.П.:** - Такая на першы погляд добрая пастанова потым перакрэліваецца нястачаю, прыкладам, сродкаў. Чыноўнік, карыстаючыся гэтаю «падставаю», можа і не дапусціць стварэння беларускамоўных плыняў.

Нягледзячы на пэўны скепсіс, міністэрская Праграма ўжо рэалізоўваецца.

**Л.Д.:** - На сёння адзін з пунктаў гэтай праграмы практычна ў стадыі выканання. Прынята пастанова стварыць на базе менскай школы №23 беларускамоўную гімназію. Ініцыятыва адкрыцця гімназіі належала Бацькоўскай радзе, што існуе пры Таварыстве беларускай мовы. Адкрыццё гімназіі - падзея даволі незвычайная на фоне агульнай дзяржаўнай палітыкі ў сферы адукацыі. Ці закончыцца чым добрым супрацоўніцтва ўладаў і грамадства, стане ясна 1 верасня.

Наогул жа, спробы адкрыць новыя беларускія школы або класы - не тое, што гімназію, - у нашай краіне сутыкаюцца з мноствам цяжкасцяў. Тое, што магчыма юрыдычна, не магчыма фактычна. Каб адкрыць беларускую школу, трэба шматкроць абысці адпаведныя інстанцыі, пры гэтым станоўчы вынік не гарантаваны. Да таго ж беларускамоўныя грамадзяне дзейнічаюць паасобку, незгуртавана.

Але існуе яшчэ адна праблема: чаму бацькі пры кожнай нагодзе пераводзяць сваіх дзяцей у расейскамоўныя класы і школы. Што выступае асноўным матывам?

На гэтае пытанне паспрабавала адказаць Алена Анісім:

- Адміністрацыя не ва ўсіх школах забяспечвае заяўлены ўзровень навучання дзяцей па-беларуску. Скажам, ёсць у нас «беларуская гімназія (не буду казаць, якая), дзе прадметаў не выкладаюць па-беларуску. Настаўнік прыходзіць у клас і пытаецца: «Якою моваю вам выкладаць прадмет?» Паколькі ў ВНУ большасць прадметаў выкладаюць па-расейску, дзеці кажуць: «Выкладайце па-расейску».

Беларускамоўная школа можа існаваць толькі пры ўмове стварэння беларускага універсітэта. Будзе беларускі універсітэт - будзе беларускаю навука і грамадскае жыццё. Цяпер жа, калі па-беларуску «гавораць» толькі гісторыкі, філолагі ды часам географы - пра перспектывы мовы няма чаго казаць. Мова павінна абслугоўваць усе сферы жыцця грамадства - ад судоў да аэрапортаў, ад сельсаветаў да Адміністрацыі прэзідэнта.

А інакш будзе так, як расказвае Святлана ¨кша: - Мы неяк ехалі са старэйшым сынам, Алесем, у тралейбусе і пачулі, як маці з дачкою гаварылі па-беларуску. У Алеся з'явіўся агеньчык у вачах, ён кажа: «Мама, глядзі, мы не адзінокія...» У нашым раёне, Кунцаўшчыне, чуеш і бачыш дзяцей, якія размаўляюць па-беларуску. Гэта вельмі рэдка... Дзеці хочуць, бацькі не вытрымліваюць...

Паводле апошняга перапісу 37% жыхароў РБ гавораць па-беларуску. Але пераканацца ў гэтым на практыцы бадай немагчыма. На вуліцах гучыць у найлепшым разе трасянка. Нармальная ж мова - рэдка. Беларускамоўныя гавораць па-беларуску пераважна дома, а ў краме, як адзін славуты паэт, просяць «хлебушка с изюмчиком». У горадзе беларускую мову найчасцей чуваць ад студэнтаў. Але колькі тых студэнтаў... Між тым, магчымасці вучыцца па-беларуску ёсць, праўда, каб гэтую магчымасць здзейсніць, трэба нястомна патрабаваць і дамагацца выканання пастановаў Міністэрства адукацыі. Бо, паводле згаданай вышэй міністэрскай Праграмы, калі студэнты пажадаюць адкрыць беларускамоўную плынь, адміністрацыя універсітэта абавязаная пайсці насустрач.

У пытанні пашырэння сферы ўжывання беларускай мовы ў ВНУ кіраўніцы ТБМ Людміла Дзіцэвіч і Алена Анісім спадзяюцца на закон.

**А.Анісім:** - Пытанне з наборам у беларускія класы развяжацца тады, калі сярэднія і вышэйшыя навучальныя ўстановы пяройдуць на беларускую мову выкладання. Паказальна, што пра гэта кажам не толькі мы, але кажуць і адказныя асобы.

**Ад рэдакцыі:** Міністэрства адукацыі пакуль не плануе адкрываць у Менску беларускі нацыянальны універсітэт. Акрамя таго, з прычыны нястачы сродкаў поўная рэалізацыя дзяржаўнай праграмы разьвіцця беларускай мовы застаецца пад вялікім пытаннем. Пад пытаннем - і будучыня беларускай мовы, але гэта - іншая тэма для гутаркі.

**Паводле Радыё Рацыя**

*Не пакідайце мовы беларускай, каб не ўмерлі! (Ф. Багушэвіч)*

# ЧУЖАЯ ВІЛЬНЯ

Я ДАЎНО МАРЫЎ ТРАПІЦЬ У ВІЛЬНЮ. У ГОРАД, ЯКІ АДЫГРАЎ БАДАЙ ШТО НАЙВЯЛІКШУЮ РОЛЮ Ў ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ. У ВІЛЬНЮ – СТАЛІЦУ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА І ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ. Я МАРЫЎ УБАЧЫЦЬ НАШУ ВІЛЬНЮ, А АПЫНУЎСЯ Ў ЧУЖЫМ ГОРАДЗЕ.

Літва сёння – замежжа, куды можна трапіць толькі з візай. Калі адкрываць яе непасрэдна ў літоўскім пасольстве ў Менску, яна будзе каштаваць 10$, а калі праз турыстычныя фірмы – 20-25$. Перавага другога варыянта – не трэба ехаць у Менск, занёс у берасцейскую турфірму пашпарт і праз 10 дзён усё гатова.

Нарэшце, віза набыта, білеты куплены, і зімнім сонечным ранкам наш цягнік прыбыў у Вільню. Першае, што патрэбна было зрабіць, гэта знайсці свой гатэль, дзе мой віленскі сябар зарэзэрваваў мне месца. Гэты гатэль належаў міжнароднай моладзевай асацыяцыі "Filaretaj", створанай у Вільні ў пачатку 90-х гг. Асацыяцыя ахоплівае дзесяткі тысяч сяброў з Літвы, Польшчы, іншых краін свету. Стаць сябрам асацыяцыі можа кожны жадаючы. Патрэбна толькі заплаціць 30 літаў (7,5$). Сябры асацыяцыі маюць пэўныя скідкі на пражыванне ў гатэлях, якія належаць "Filaretaj". Для іх арганізоўваюцца розныя падарожжы па гарадах і прыгожых месцах Літвы, амаль безкаштоўна даюцца напракат веласіпеды, ролікі ці іншы спартовы інвентар. Кошт пражывання ў такім гатэлі – ад 6 (пакой на 6-8 чалавек), да 9$ (пакой на дваіх). Танней жыць у Вільні немагчыма, хіба што дамаўляцца з бабулькамі.

Гатэль знаходзіўся ў 20 хвілінах хады ад цэнтра. Узброіўшыся фотаапаратам, я рушыў на доўгачаканае спатканне са старой Вільняй. Паблукаўшы вузкімі вулачкамі раёна Ужупіс, я выйшаў да артылерыйскага бастыёна, пабудаванага ў сярэдзіне XVII ст. З яго адкрываецца цудоўная панарама на р. Вільнянку. Крыху ўбаку, на Замкавай гары, узвышалася вежа Гедыміна. Ісці трэба было ў той бок, але ногі чамусьці панеслі мяне ў адваротны. Пазней я зразумеў, што цягнула мяне сюды. Я стаяў перад знакамітай Віленскай Вострай Брамай. Над ёй, у невялікай каплічцы знаходзілася каталіцкая святыня Беларусі, Літвы і Польшчы – вобраз Маці Боскай Вострабрамскай. Неба само падказала мне, што знаёмства з Вільняй трэба пачынаць з гэтага святога месца. Пакланіўшыся святыні, я рушыў па галоўнай вуліцы старажытнага горада – Вялікай.

З першага моманту знаёмства з Вільняй я быў захоплены яе вузкімі крывымі вулачкамі. Такой хаатычнай планіроўкі вуліц, як ў старой частцы Вільні, я яшчэ ніколі не сустракаў. Шырыня некаторых вулачак складала ўсяго 4-5 м. Зразумела, што на машыне там ніяк не праедзеш. Ды і няма чаго. Там трэба не ездзіць, а павольна хадзіць і насалоджвацца духам даўніны. На адной вуліцы можна сустрэць жылы будынак з элементамі готыкі, пабудаваны ў XVI ст., барокавы ці класічны палац XVIII ст., дамы XIX - пачатку XX ст.ст. А сярод іх раптам можа з'явіцца нейкі "савок". І ўсе гэтыя дамы адрэстаўраваны, даведзены да шыкоўнага стану, што не можа не выклікаць захаплення.

Віленскія храмы – асобная краса горада. Толькі ў старой частцы Вільні іх больш за дваццаць. Самы прыгожы з усіх – касцёл св. Ганны. Сярод віленцаў і зараз ходзіць легенда, быццам у 1812г. гэты храм так спадабаўся Напалеону, што той хацеў пакласці яго на далонь і забраць у Парыж. Хаця, прызнацца, для мяне Дамініканскі, Бернардзінскі ці касцёл св. Пятра і Паўла нічым не горшыя. Апроч каталіцкіх касцёлаў ёсць у Вільні чатыры праваслаўныя царквы, пратэстанскія храмы, сінагога. Праваслаўная царква св. Мікалая знакамітая тым, што ў ёй быў ахрышчаны Ганібал, прадзед А.Пушкіна.

Акрамя храмаў захаваліся і некаторыя манастыры. Большасць з іх, на жаль, знаходзіцца ў занядбаным стане, але верыцца ў іх хуткую рэстаўрацыю.



**Кафедральная плошча, Вільня. Фота: IREX/ProMedia**

Цэнтр Вільні – Кафедральная плошча. На ёй стаіць галоўны храм Літвы "Arkikatedra". Падыйшоўшы першы раз з адваротнага боку, я не зразумеў, што перада мной касцёл. Вялікі прамавугольны будынак з калонамі больш нагадваў тэатр ці палац. Да храма дабудавана капліца св. Казіміра – нябеснага заступ-ніка Літвы. У скляпеннях касцёла пахаваныя вялікі князь Аляксандр, уладар ВКЛ, кароль Рэчы Паспа-літай Ян Казімір ІІІ, знакамітая Барбара Радзівіл і многія іншыя славутыя сыны Беларусі і Літвы. Каля касцёла знаходзіцца помнік заснавальніку Вільні – вялікаму князю Гедыміну. Побач з касцёлам раней стаяў вялікакняжацкі замак-палац, які, на жаль, не захаваўся. Праўда, з 2000г. распрацоўваецца праект адбудовы палаца, і праз восем год абяцаюць яго поўнае аднаўленне. Паглядзім, але маю ўпэўненасць, што так яно і будзе. Першыя работы ўжо пачаліся.

Адразу за плошчай узвышаецца Замкавая гара. З XIV ст. на ёй знаходзіцца Віленскі верхні замак. За сваю гісторыю ён перажыў вялікую колькасць штурмаў і аблог. Абаронцы ля яго сценаў не аднойчы бачылі і крыжакоў, і татараў, і маскоўцаў, і шведаў. Ад замка захаваліся частка сценаў і вежа. На гэтай вежы знаходзіцца аглядавая пляцоўка, адкуль уся Вільня - як на далоні. Пад гарой сыходзяцца дзьве ракі – Вільнянка і Вілія. З другога боку Вільнянкі – яшчэ адзін узгорак, на якім у сярэдневеччы былі пабудаваныя тры магутныя крыжы, што ў часы Сталіна былі знесеныя, але ў 1989г. адбудаваныя зноў.

Недалека ад Кафедральнай плошчы знаходзіцца комплекс Віленскага універсітэта, даўнейшай вышэйшай навучальнай установы Беларусі і Літвы. Асабліва прыгожыя універсітэцкія бібліятэка і касцёл. Бібліятэка вытрымана ў старажытных традыцыях, таму праца ў ёй прыносіць адно задавальненне. Па другі бок вуліцы – Прэзідэнцкі палац. Тут са мной адбыўся цікавы выпадак. Вечарам я хадзіў вулачкамі старога горада і раптам выйшаў да прыгожага палаца. Прычым тратуар быў зроблены так, што я міжволі зайшоў па прыступках да ўваходных дзвярэй. Толькі там, агледзеўшыся, зразумеў, што стаю ля ўвахода ў прэзідэнцкі палац – і ніякай аховы. Адразу ўспомніўся Менск, рэзідэнцыя нашага прэзідэнта, шыльды з надпісам "Праход забаронены" за 200 м да будынка. Так бы мовіць, "почувствуйте разницу!"

Асобная размова – віленскія кафэшкі. Калі раптам узнікла патрэба выпіць піўка, гарбаты, перакусіць ці проста адпачыць, то не трэба, як у нашым Берасці, бегаць і доўга шукаць. Яны на кожным кроку, асабліва ў старым горадзе. Прычым і цэны не такія ўжо "кусачыя", хаця піва даражэй чым у Беларусі. Адным словам - адпачывай. Праўда, літоўскае піва мне не спадабалася, наша "Белавежскае" лепш.

А цяпер асаблівасць сучаснай Вільні – літоўскія назвы. Для мяне было даволі "прыкольна" хадзіць па вуліцах Кастукаса Калінаўскаса, Гедымінаса, Вітаўтаса, сфатаграфавацца ля помніка Адамасу Міцкявічусу, чуць прозвішчы Радвілаў, Пацасаў ды іншых. Літоўцаў зусім не цікавіць, што гэтыя людзі свае прозвішчы ніколі так не пісалі. Для літоўцаў усе яны на "-ас" і ўсе свае. І ніхто нацыяналізмам гэта не лічыць. А ў нас?

Вільня падаравала не толькі захапленне, але і некаторую крыўду. Крыўду за нас, беларусаў, за нашую дзяржаву. Я імкнуўся патрапіць у Базыліянскія муры. Храм і кляштар св. айцоў базыліянаў быў пабудаваны беларускай вуніяцкай грамадой у пачатку XVII ст. На працягу першай паловы XX ст. тут быў палітычны і культурны цэнтр беларусаў у ІІ Рэчы Паспалітай. Тут працавалі А. Луцкевіч, Б. Тарашкевіч, знаходзілася беларуская бібліятэка і музей ім. І. Луцкевіча. Польскія ўлады, нягледзячы на моцную паланізацыю, так і не змаглі знішчыць гэты цэнтр. І вось цяпер гэтыя муры належаць Украінскай грэка-каталіцкай грамадзе. А дзе ж беларусы? Пытанне без адказу.

Яшчэ большую крыўду я атрымаў пасля наведвання беларускага касцёла. На імшу сабралося чалавек пяцьдзесят, з іх каля трацiны - дзеці. Я быў рады, што беларускасць у Вільні ўсё ж жыве. Але апошнія словы ксяндза горка ўразілі мяне і ўсіх прысутных. Ен заявіў, што больш не мае грошаў, каб утрымліваць касцел. Прыхаджан даволі няшмат, мецэнатаў няма, ніхто не хоча ўтрымліваць беларускі касцёл, ён ім не патрэбны. Самае горшае тое, што касцёл не патрэбны і нашай дзяржаве, беларускай каталіцкай царкве. Чаму так, я не разумею. Ці нашыя суайчыннікі па-за межамі бацькаўшчыны нам не патрэбныя? Гэта была апошняя беларуская імша ў храме. І ці будуць калі-небудзь яшчэ ў Вільні служыць па-беларуску, аднаму Богу вядома.

Пасля такіх выпадкаў я нечакана зразумеў, што мы канчаткова страцілі сваю Вільню. Цяпер казаць, што гэта і наш горад, на маю думку, мы ўжо не маем права. Дай Божа, каб я памыліўся.

**А.ВАЛАЦЮГА**

ГІСТАРЫЧНЫ КАЛЯНДАР

# САКАВІК – ЧАС АБУДЖЭННЯ

ШАНОЎНЫ СЯБАР! НОВАЯ РУБРЫКА «ДЗЕДЗІЧА» - «ГІСТАРЫЧНЫ КАЛЯНДАР» - БУДЗЕ РАСПАВЯДАЦЬ, ЧЫМ ЗНАКАМІТЫ ТОЙ ЦІ ІНШЫ ДЗЕНЬ У БЕЛАРУСКАЙ ГІСТОРЫІ. СПАДЗЯЕМСЯ, ШТО ТЫ ЗНОЙДЗЕШ ТУТ ШМАТ КАРЫСНАГА І ЦІКАВАГА. ЗАПРАШАЕМ АМАТАРАЎ ГІСТОРЫІ ДАЛУЧЫЦЦА ДА РАСПРАЦОЎКІ НОВАГА ПРАЕКТА - НАЦЫЯНАЛЬНАГА ГІСТАРЫЧНАГА КАЛЕНДАРА - ПРЫНОСЬЦЕ ЦІ ДАСЫЛАЙЦЕ ІНФАРМАЦЫЮ АБ ВЫБІТНЫХ ДЗЕЯЧАХ НАШАЙ РАДЗІМЫ.

## 1 САКАВІКА

1 сакавіка 1863г. нарадзіўся **Акутагава Руноскэ.** Японец, здавалася б, – далёкі чалавек, але ж такі блізкі, калі чытаеш ягоную “Браму Расямон“ альбо споведзь “Жыццё ідыёта“. Акутагава быў мысляром усё ж больш еўрапейскага складу і еўрапейскай школы, чым японскай. Знойдзеце ў яго матывы і італьянскага нэарэалізму, і глыбокае разуменне Дастаеўскага, і экзістэнцыялізм Альбера Камю, які, здаецца, у часы Акутагавы яшчэ не пачынаў пісаць, і дакладнага сучасніка Акутагаві Максіма Гарэцкага, у якога тонкія перажыванні герояў сустракалі такую глухую сцяну рэчаіснасці, што часам героі не вытрымлівалі. Як той селянін Антон, што лёг на касу. Зрэшты, японцы ўсё адно больш чуллівыя. І калі ў Гарэцкага зрабіў сабе смерць герой, дык у Акутагавы скончыў самагубствам аўтар. Бясконца шкада і бясконца радасна ад таго, што ён па сабе пакінуў, – ад ягоных твораў. Дзіўна толькі, што прыйшоў на свет Акутагава ў год нашага паўстання за волю і за беларушчыну.

1 сакавіка 1881г., нібы ў працяг гэтага паўстання, адбылася іншая падзея, азораная тымі самымі ідэаламі. Беларускі тэрарыст Ігнат Грынявіцкі кінуў бомбу ў расейскага цара Аляксандра II. Акцыя была ўдалая, бомба разарвалася як трэба, і імператар быў забіты. Натуральна, у сучасніка такі акт выклікае супярэчлівыя пачуцці. Разумееш, што тэрарызм — гэта кепска, асабліва сёння. І адначасова не можаш не адчуваць гонар за свайго супляменніка Ігната Грынявіцкага, якому хапіла столькі волі, мужнасці, рашучасці зрабіць такі адчайны ўчынак для свайго краю, колькі сёння не хопіць бадай і сотні, а можа і тысячы нашых супляменнікаў.



1 сакавіка 1933г. пакінуў гэты свет адзін з любімых беларусамі паэтаў – **Уладзімір Жылка.** Паводле адной тэорыі, у беларусаў ёсць паэты вялікія, такія, як Купала і Колас, і любімыя, такія, як Максім Багдановіч. Бясспрэчна, да другіх належыць і Жылка. Трагічны лёс, фантастычныя вершы, вялікая будучыня. Некалі імем гэтага паэта будуць называць вуліцы ў беларускіх гарадах. А яшчэ ён – аўтар надзвычай тонкіх паэтычных рэфлексіяў пра Вільню, горад, які моцна любіў і ў якім марыў быць пахаваны.

Бывай, мой ранак срэбнаросы!
Бывай, мой дзень клапот, пакут!
Прайшоўшы свет раздзетым, босым,
Пара падумаць і пра кут:
На могілках зацішных Росы
Хачу спачыць ад каламут.
Сачыцьмуць мой спакой найпільней
Муры старой, каханай Вільні.

## 2 САКАВІКА



2 сакавіка 1608г. памёр **Канстанцін Астрожскі,** выдатны ваяк, пераможца расейскіх захопнікаў у бітве пад Воршай. Астрожскі вядомы не толькі вайсковымі справамі. ¨н – фундатар цэркваў. Збудаваныя на ягоныя грошы храмы і дагэтуль стаяць у старой сталіцы Вялікага Княства Літоўскага – Вільні.

**(Працяг на с.6)**

ЗАНЯДБАНАЯ СПАДЧЫНА

# ”МУЗЫЧНЫЯ СЦЕНЫ” КОСАЎСКАГА ПАЛАЦА

У МІНУЛЫМ НУМАРЫ “ДЗЕДЗІЧА” БЫЎ НАДРУКАВАНЫ АРТЫКУЛ МІКАЛАЯ КАРНЕЙЧУКОВА “ХТО ВЫРАТУЕ ПАЛАЦ У КОСАВА”, ШТО РАСПАВЯДАЎ ПРА НЕЗАЙЗДРОСНЫ СТАН ПРЫГОЖАГА ПОМНІКА БЕЛАРУСКАЙ ГІСТОРЫІ. ПАД ПСЕЎДАНІМАМ М.КАРНЕЙЧУКОЎ ХАВАЎСЯ СТУДЭНТ ГІСТФАКА БДУ, МЕНЧУК ПАВАЛ СВЯРДЛОЎ, ЯКІ СЁННЯ ПРАЦЯГВАЕ ТЭМУ Ў НОВЫМ АРТЫКУЛЕ. ПРОСІМ ВАС НЕ ПАКІДАЦЬ ЯГО БЕЗ УВАГІ І БУДЗЕМ РАДЫ ПАЧУЦЬ ВАШЫЯ ДУМКІ АБ ПРАБЛЕМЕ АДНАЎЛЕННЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ.

Нам надакучыла глядзець на тое, як разбураюцца ўсімі забытыя, занядбаныя помнікі беларускай гісторыі. Гэта здарылася ў 2001 годзе, калі мы ўпершыню апынуліся ў Косаве. Менавіта гэтаму велічнаму, але, на жаль, напаўразбуранаму будынку мы жадаем дапамагчы ў першую чаргу. Таму мы распачалі праграму “Косаўскаму палацу – жыць!”.

Мы – пяцёра студэнтаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Зразумела, што студэнты-валанцёры не багатыя ані на грошы, ані на паўнамоцтвы для правядзення рэстаўрацыйных работ. Затое ў нас ёсць жаданне і магчымасць дзейнічаць. Сваёй галоўнай задачай на дадзены момант мы лічым прыцягненне уладных структур, як мага большага кола людзей добрай волі, грамадскіх арганізацый і мецэнатаў да супрацоўніцтва з мэтай аднаўлення Косаўскага палацава-паркавага ансамбля. Хаця рэстаўрацыя – гэта канчатковая мэта, шлях да яе вельмі доўгі. Першы крок ужо зроблены – у верасні 2001 года пад Косавам быў арганізаваны валанцёрскі лагер, за тыдзень існавання якога былі праведзены работы па добраўпарадкаванні тэрыторыі, што прылягае да палаца.

У траўні 2002 года плануецца правядзенне ў Косава гісторыка-культурнага фестывалю “Музычныя сцены”. Не зусім звычайная назва тлумачыцца адным з самых прыгожых паданняў, звязаных з будаўніцтвам палаца. Калісьці адна з яго сцен была музычнай – калі па ёй грукалі, яна гучала ў адказ – цудоўна і мілагучна. Сёння палац мёртвы, і сцяна згубіла свае незвычайныя якасці. Мы хочам, каб у сцены палаца вярнулася музыка. Музыка, якая дае Жыццё. Музыка, якая прымушае верыць у лепшае.

Наша мэта – папулярызацыя беларускай гісторыі і культуры. Мы хочам зацікавіць людзей, у сэрцах якіх трывала засела абыякавасць да лёсу помнікаў гісторыі роднай зямлі, прыцягнуць увагу тых, хто здольны аказаць дапамогу ў аднаўленні палаца. Захаваць нашу знікаючую памяць бадай таксама важна, як зберагчы прыроду, што гіне на вачах. Таму трэба выступаць ў СМІ, завязаць абмеркаванне ў грамадстве. Прыцягнуць увагу немагчыма без правядзення буйных акцый. Такіх, напрыклад, як плануемы фестываль беларускай музыкі і культуры.

Што такое ”Музычныя сцены”? Некалькі сотцен людзей збіраюцца ў палатачных лагерах вакол палаца, каб папрацаваць на яго карысць колькі дзён, патусавацца разам, адпачыць ад гарадской мітусні, а па вечарах пайграць на гітарах, паспяваць ды проста паслухаць музыку. Гэта выязны фестываль акустычнага року – першы, які пройдзе ў межах Беларусі. Але не толькі музыка, таксама клопат і непакой за родную гісторыю аб'ядноае яго ўдзельнікаў і гледачоў. Удзельнічаць у музычным фестывалі можа кожны, хто піша, спявае і грае непапсу. Мы хацелі б бачыць на фестывалі як мага болей берасцейскіх гуртоў, бо ўпэўненыя, што гэта ўзбагаціць яго праграму. Фінансавае пытанне пакуль што застаецца адкрытым, але бліжэй да красавіка аргкамітэт фестываля вырашыць яго. Таксама пакуль невысветленым застаецца склад удзельнікаў.

Атрымаць тлумачэнні, паведаміць аб жаданні ўзяць дзел ў фестывалі Вы можаце Паўлу Свярдлову (тэл.: (017) 228-18-22), Аляксандру Дуко (тэл.: (017) 224-52-11), Дзіме Шаўчуку (тэл.: (017) 233-92-25), па e-mail: kossovo@tut.by, альбо ў “Дзедзіч”.

**Ад рэдакцыі:** упэўненыя, што калі нават сталічныя жыхары захапіліся цудоўнай прыгажосцю Косаўскага палаца, то нам з вамі, землякі-берасцейцы, сам лёс наканаваў рушыць на дапамогу хлопцам з Менска.

Як вядома, “Дзедзіч” таксама плануе правесці недалёка ад Косаўскага палаца летні лагер па аднаўленні сядзібы Т.Касцюшкі, на якой работы запланаваны крыху пазней – на жнівень. Так што ў берасцейскага студэнцтва ёсць выдатная магчымасць акупіраваць гэтым летам Івацэвіцкі раён і пазнаёміцца з яго прыродным і рукатворным харастом.

ГІСТАРЫЧНЫ КАЛЯНДАР

# САКАВІК –

(Працяг. Пачатак на с.5)

2 сакавіка 1918г. нарадзіўся беларускі паэт **Алесь Бачыла.** ¨н паходзіць з вёскі Лешніца, што пад Пухавічамі. Шмат якія ягоныя вершы пакладзены на музыку і сталі вядомымі песнямі, такімі, як адзін з варыянтаў нацыянальнага гімна Беларусі “Радзіма, мая дарагая”.

2 сакавіка 1931г. нарадзіўся першы і апошні прэзідэнт СССР Міхаіл Гарбачоў.

Наступная памятная дата таксама звязаная з прэзідэнтамі. Менавіта 2 сакавіка ў 1994г. Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь прагаласаваў за прэзідэнцкую форму кіравання краінай. Між іншым, апазіцыя ў тым галасаванні не ўдзельнічала. Быццам адчувалі, да чаго ўсё гэта ўрэшце прывядзе.

## 4 САКАВІКА

4 сакавіка 1634г. ў Лышчыцах, што пад Берасцем, нарадзіўся беларускі шляхціц **Казімір Лышчынскі,** які ў будучыні стаў славутым мысляром. Вучыўся Лышчынскі ў Берасцейскім езуіцкім калегіуме і ў духоўнай акадэміі ў Кракаве. Нейкі час працаваў выкладчыкам, пасля – юрыстам, а ўрэшце падаўся ў палітыку – быў паслом ад Берасця ў сойме Вялікага Княства. Пры тым Лышчынскі разважаў пра тое, як уладкаваны свет, і занатоўваў свае развагі на паперы. ¨н марыў пра стварэнне грамадства роўнасці і братэрства, жадаў бачыць “свет без улады, гарады без начальнікаў, народы без гаспадароў“. Гэткай рэвалюцыйнай сцяжынай Лышчынскі прыйшоў да атэізму. У свае 53 гады ён піша «Трактат пра неіснаванне Бога». Натуральна, XVII ст. было зусім не той эпохай, калі атэістычныя выказванні маглі рабіцца беспакарана. Лышчынскага зняволілі, і ўрэшце соймавы суд прысудзіў яго да пакарання смерцю. Філасофа абезгаловілі, а пасля спалілі на вогнішчы.


К.Лышчынскі.
Мастак С.Свістуновіч

4 сакавіка 1678г. нарадзіўся слынны італьянскі кампазітар **Антоніо Вівальдзі.** Ягоную музыку ахвотна слухаюць па ўсім свеце, бо гучыць яна вельмі сучасна, быццам пісалася сёння, а не трыста гадоў таму.

4 сакавіка 1872г. нарадзіўся чалавек вельмі дзіўнага лёсу. Гэта **Казімір Петрусевіч,** які ўмудрыўся правіць сябе ў некалькіх эпохах і нібы злучыў сваім лёсам неспалучальныя эпізоды беларускай гісторыі. ¨н нарадзіўся на Капыльшчыне, скончыў Слуцкую гімназію і Кіеўскі універсітэт. Стаў адвакатам. Яшчэ ў Кіеве Петрусевіч стварыў групу польскай сацыял-дэмакратыі. За гэта быў арыштаваны і высланы ў Екацярынаслаў. Вось жа ад екацярынаслаўскіх сацыялістаў ён прыехаў у Менск дэлегатам І з’езду РСДРП. Хатка, у якой адбываўся той з’езд, дагэтуль беражліва захоўваецца ў Менску, каля плошчы Перамогі. І з’езд РСДРП насамрэч не меў ніякага дачынення ані да расейскіх бальшавікоў, якія пазней прысвоілі сабе назву партыі, ані да ленінізму. Пра тое сведчыць лёс шасці ўдзельнікаў з’езду, якія ніколі ў будучыні не былі заўважаныя ў радах ленінскай партыі. Пасля з’езду Петрусевіч вярнуўся ў Екацярынаслаў, быў там ізноў арыштаваны і высланы гэтым разам у Волагду. Адтуль вярнуўся ў Менск і заняўся адвакацкай практыкай. У якасці абаронцы ён браў удзел, напрыклад, у судовым працэсе над Якубам Коласам, калі царскія ўлады на год засадзілі паэта ў славуты Пішчалаўскі замак – цяперашнюю Валадарку. У часе Першай Сусветнай вайны Петрусевіч працуе ў Гомелі, у земскім камітэце, пасля ў Менску ўзначальвае Чырвоны крыж. Бальшавікі наступаюць, а заснавальнік іхняй партыі, замест таго, каб іх вітаць, перабіраецца ў Вільню, працуе ў Віленскай адвакатуры і выкладае права ў Віленскім універсітэце. Тут у якасці абаронцы Петрусевіч выступае на працэсах Беларускай грамады, паэта Максіма Танка, Саюза моладзі. За гэта польскія ўлады пазбаўляюць яго права выкладаць. Мінулую вайну Петрусевіч правёў у Вільні, адкуль пасля вайны перабраўся ў Варшаву, дзе і памёр у 1949-м годзе. Згадзіцеся, лёс настолькі ж дзіўны, наколькі загадкавы, і варта было пра яго распавесці падрабязна.

## 5 САКАВІКА

5 сакавіка 1887г. нарадзіўся польскі этнограф **Казімір Машынскі,** які шмат зрабіў дзеля вывучэння традыцыйнай культуры беларусаў. Працяглы час ён даследаваў адну беларускую вёску – Хораства ў Салігорскім раёне. Напісаў манаграфію “Усходняе Палессе“ і некалькі прац, прысвечаных палескай музычнай культуры. Яшчэ да вайны выйшла кніга Машынскага “Наваградчына ў этнаграфічных адносінах“.

5 сакавіка 1896г. прыйшоў на свет самы савецкі беларускі пісьменнік і навуковец **Кандрат Крапіва,** якога кожны беларус са школы ведае як таленавітага байкапісца.

5 студзеня 1901г. расейская праваслаўная царква афіцыйна адлучыла ад сябе пісьменніка **Льва Талстога.** У рашэнні Сінода было сказана: “Вядомы свету пісьменнік, расеец паводле нараджэння, праваслаўны паводле хросту і выхавання свайго, граф Талстой, у спакусе гордага розуму свайго дзёрзка паўстаў на Госпада і на Хрыста Ягонага і на святы ягоны здабытак, яўна перад усімі адрокся ад сваёй маці, праваслаўнай царквы, і прысвяціў дадзены яму ад Бога талент на распаўсюджанне вучэнняў, што супярэчаць Хрысту і царкве“ і г.д. А галоўная крыўда была выказаная за тое, што Талстой не звяртаецца да царквы. На гэтае адрачэнне пісьменнік адказаў наступнымі словамі: “Тое, што я выракся царквы, якая называе сябе праваслаўнай, гэта цалкам справядліва. Але выракся я не таму, што паўстаў на Госпада, а, наадварот, толькі таму, што ўсімі сіламі душы жадаў служыць Яму. Я перакана́ўся, што вучэнне царквы ёсць тээрэтычна кaварная і шкодная хлусня, практычна ж – гэта збор самых грубых забабонаў і варажбы, што затуляюць сабою сэнс хрысціянскага вучэння“. Між іншым, у сваім запавеце Талстой прасіў, калі будзе паміраць, каб не дапускалі да яго царкоўных служак, і “мёртвае маё цела каб прыбралі чым хутчэй, без усякіх над ім заклінанняў і малітваў, як прыбіраюць усялякую брыдкую і непатрэбную рэч, каб яна не замінала жывым“.

5 сакавіка 1910г. нарадзіўся **Аўген Калубовіч,** гісторык, літаратуразнаўца і палітык. Ягоны пакручасты лёс па-свойму тыповы для тагачасных беларускіх гуманітарыяў: вучоба ў Менску, сталінскія рэпрэсіі, вяртанне ў Беларусь, нямецкая акупацыя, эміграцыя. Як навуковец Калубовіч вызначыўся тым, што збіраў звесткі пра страчаныя помнікі беларускай культуры, – разбураныя, спаленыя, знішчаныя.



5 сакавіка 1940г. расейцы расстралялі ў вёсцы **Катынь** на Смаленшчыне 5 тысяч польскіх афіцэраў. Трэба мець на ўвазе, што сярод тых палякаў было вельмі шмат беларусаў, прызваных у польскае войска з Заходняй Беларусі, якая да 1939г. уваходзіла ў склад Польшчы. Каб затушаваць гэты страшэнны факт, савецкая прапаганда адшукала і зрабіла знакавай вёсачку Хатынь пад Лагойскам, якую разам з людзьмі спалілі немцы. Такім чынам звесткі пачыналі блытацца, можна было паблытаць і вінаватых у трагедыі. Хатынь – Катынь гучыць надта падобна. На здымку: 28 ліпеня 2000г. у Катыні адкрыты мемарыяльны комплекс. Сваякі забітых там палякаў упрыгожваюць пліты мемарыяла з імёнамі сваіх родных.

5 сакавіка 1953г. адбылася паваротная падзея ў гісторыі Савецкага Саюза. Памёр Сталін. “Навечна закрыліся вочы, што спакойна і зорка глядзелі ў глыбіню насталай светлай эры. Расціснулася рука, што больш за чвэрць веку ляжала на стырне сусветнай гісторыі. Пайшоў вялікі кармілец, які вёў нас праз усе гэтыя пераломныя гады, поўныя баявых радасцяў, бураў і надзеяў“, – пісала газета “Праўда”. Галоўным наступствам смерці дыктатара стала адкрыццё брамы Гулагу. Сотні тысяч невінаватых ворагаў народу змаглі выйсці на волю.

## 7 САКАВІКА

7 сакавіка 1850г. нарадзіўся кіраўнік Чэшскай дзяржавы **Тамаш Масарык.** Калі цяперашнія беларускія палітыкі кажуць, што некалі Зянон Пазняк можа вярнуцца з эміграцыі ў Беларусь, так бы мовіць, на белым кані, дык часцяком параўноўваюць Пазняка з Масарыкам. У 1918г. Тамаш Масарык вярнуўся ў Чэхію з пяцігадовай эміграцыі ў Францыі і быў абраны прэзідэнтам краіны. А ўсяго чэхі выбіралі яго на найвышэйшую пасаду ажно чатыры разы, і быў ён прэзідэнтам краіны амаль семнаццаць гадоў. Чэхі дагэтуль згадваюць Масарыка з удзячнасцю, а вось камуністычная прапаганда яго моцна не любіла, бо не хацеў ён будаваць у сябе на радзіме камунізм, а кіраваўся прынцыпамі развіцця заходнееўрапейскіх краін. Варта тут прыгадаць славутую прыпавесць Уладзіміра Караткевіча пра тое, што Бог стварыў беларусаў самымі прыгожымі, разумнымі і дужымі людзьмі на зямлі і даў ім самую лепшую ў свеце краіну. А каб не было ім раю, даў самае горшае ў свеце начальства. Вось жа чэхам можа не так пашанцавала з краінай і з самімі сабою, затое з кіраўнікоў сваіх ім ёсць каго ўспомніць добрым словам. А якога беларускага кіраўніка прыгадаць, дык і не прыгадаеш. Машэраў сімпатычны быў, але для Беларусі болей рабіў шкоды, наступствы якой давядзецца яшчэ доўга пераадольваць. Хіба што Алесь Чарвякоў згадваецца, які сапраўды думаў пра дабро для краіны. Ягоны дзень нараджэння мы будзем адзначаць 8 сакавіка.

*Ад прадзедаў, спакон вякоў... (Я. Купала)*

# ЧАС АБУДЖЭННЯ

7 сакавіка 1872г. нарадзіўся яшчэ адзін кампазітар – **Васіль Залатароў.** Увогуле ён лічыцца расейскім кампазітарам, вучнем Рымскага-Корсакава. Але якраз у часы беларусізацыі, у 1920-я гады мінулага стагоддзя, Залатароў пераехаў у Менск і ўзяў удзел у фармаванні беларускай кампазітарскай школы. Самыя вядомыя творы Залатарова – балет “Князь-возера“, а таксама “Беларуская танцавальная сюіта“, шмат песень на словы беларускіх паэтаў.

7 сакавіка 1931г. пакінуў гэты свет **Павал Дземідовіч,** даследчык беларускай этнаграфіі і фальклёру. Паходзіць ён з той самай вёскі, што і Якуб Колас – з Мікалаеўшчыны пад Стоўбцамі. Скончыў Віленскі настаўніцкі інстытут, напісаў шмат працаў пра беларускія народныя святы. Напрыклад, “Калядныя святы“, “Вялікдзень у сялян беларусаў“, “Радаўніца на Беларусі“, “Купалле ў беларускай вёсцы“ ды іншыя.

7 сакавіка 1943г. савецкія партызаны расстралялі ў Менску беларускага палітыка **Фабіяна Акінчыца.** Акінчыц яшчэ з дарэвалюцыйных часоў браў чынны ўдзел у працы адраджэнскіх арганізацый і суполак, перад вайною быў старшынёй дабрачыннага таварыства ў Беларускім нацыянальным камітэце ў Вільні.

І яшчэ адна падобная да папярэдняй дата. 7 сакавіка 1991г. хуліганы на адной менскай вуліцы забілі паэта **Анатоля Грачанікава.** На той момант Грачанікаў быў галоўным рэдактарам часопіса “Маладосць“.

## 8 САКАВІКА

8 сакавіка – **Міжнародны жаночы дзень.** Чаму менавіта сёння і з чым гэта звязана? Гісторыя даволі заблытаная, бо адразу некалькі падзеяў прэтэндуюць на тое, каб быць пунктамі адліку гэтага свята. У 1857г. тэкстыльныя работніцы Нью-¨рка ідуць маршам па вуліцах горада з пратэстам супраць нізкіх заробкаў і кепскіх умоў працы. Але ўся рэч у тым, што гэтыя факты нібыта не знаходзяць дакументальнага пацвярджэння і былі “знойдзеныя“ ўжо ў 50-я гады ХХ ст. дзеля таго, каб аддзяліць святкаванне Міжнароднага жаночага дня ад савецкай гісторыі. Праўда, у 1908г. таксама ў Нью-¨рку сацыял-дэмакратычная арганізацыя жанчын праводзіць масавы мітынг у абарону правоў жанчын. На наступны год Сацыялістычная партыя Амерыкі абвяшчае апошнюю нядзелю лютага Нацыянальным жаночым днём. А ў 1910г. на ІІ Міжнароднай канферэнцыі жанчын-сацыялістак у Капенгагене з ініцыятывай штогод адзначаць Міжнародны жаночы дзень выступае Клара Цэткін. Упершыню ў Еўропе свята адзначаецца 19 сакавіка 1911г. як дзень перамогі народнага паўстання ў Берліне, а яшчэ праз два гады дата будзе перанесеная на 8 сакавіка ў памяць жаночага дня. У 70-я гады Міжнародны жаночы дзень прыме ААН.

8 сакавіка 1892г. нарадзіўся **Алесь Чарвякоў,** кіраўнік Беларусі, які за савецкім часам, у 20-я гады здолеў разам з паплечнікамі правесці беларусізацыю краіны у сферы асветы і культуры. Паходзіць Чарвякоў з Дукоры, што пад Пухавічамі. У 1915г. ён скончыў Віленскі настаўніцкі інстытут, быў адным са стваральнікаў беларускай сацыял-дэмакратыі, а пасля абвяшчэння БССР стаў старшынёй ураду. Тады Чарвякоў надта шмат ездзіў па ўсёй Беларусі, сустракаўся з людзьмі, марыў пра росквіт сваёй Бацькаўшчыны. Але ж нацыянальны росквіт за бальшавікамі не мог працягвацца доўга. У 30-я гады на Чарвякова пачалі пісаць даносы, яго сталі кляймíць у газетах. Тады ён зразумеў, што гэта канец усім ягоным памкненням і скончыў жыццё самагубствам. Шкада, бо згадваюць, што надта любімы быў у народзе кіраўнік. Больш любімых, мабыць, у Беларусі ў ХХ ст. і не бывала.

Кіраўнікі БНР не паспелі разгарнуцца ва ўсю моц, каб сапраўды ўзяць у рукі ўладу па ўсёй краіне. Перашкодзілі акупацыі – нямецкая, польская, пасля савецкая. 8 сакавіка 1928г. пакінуў гэты свет першы прэзідэнт БНР **Пётра Крэчэўскі, наш зямляк, ураджэнец Кобрынскага павету.** ¨н памёр у Празе, калі ўрад БНР ужо некалькі гадоў існаваў на эміграцыі. І сёння на пражскіх Альшанскіх могілках ёсць помнік Пётру Крэчэўскаму, ля якога штогод на 25 сакавіка збіраюцца тутэйшыя беларусы і госці.



Паэт **Славамір Адамовіч** адзначае сёлета свае 40-я ўгодкі 8 сакавіка. Імя «песняра змагання і кахання» шырока загучала ў сярэдзіне 1990-х, калі за верш «Забі прэзідэнта» паэт трапіў за краты. Паэтычны зборнік Славаміра Адамовіча «Плавільшчыкі расы» стаўся бестселерам сучаснай беларускай літаратуры.

## 9 САКАВІКА

9 сакавіка 1454г. нарадзіўся **Амерыга Веспучы,** слынны фларэнтыйскі мараходзец, імя якога ўвасобленае ў гісторыі, бадай, як нічыё іншае. Менавіта ў гонар Амерыга Веспучы названая Амерыка.

9 сакавіка 1814г. нарадзіўся **Тарас Шаўчэнка,** украінскі паэт, які стаў народным сімвалам Украіны. Аўтар слыннага “Кабзара“, Шаўчэнка лічыцца яшчэ і заснавальнікам нацыянальнай літаратурнай мовы. Ягоны жыццяпіс звязаны з Вільняй. Шмат якія ягоныя творы перакладаліся на беларускую мову.



9 сакавіка 1883г. нарадзіўся **Францішак Аляхновіч,** беларускі драматург, адзін са стваральнікаў новага нацыянальнага тэатру. ¨н прыйшоў на свет у Вільні, скончыў драматычную школу ў Варшаве, пасля вярнуўся дадому і наладзіў тут першую беларускую вечарыну, дзе паставіў п‘есу “Па рэвізіі“ М.Крапіўніцкага, арганізаваў сваю Беларускую драматычную дружыну, разам з якой ставіў сваю першую ўласную п‘есу “На Антокалі“. Дарэчы, гэтую п‘есу Аляхновіч напісаў у турме, куды быў пасаджаны расейскімі ўладамі напярэдадні І Сусветнай вайны. Пасля вайны Аляхновіч выдае ў Вільні розныя пэрыёдыкі і піша п‘есы “Чорт і баба“, “Бутрым Няміра“, “Пан міністар“, друкуе першую працу з гістарычнага тэатразнаўства “Беларускі тэатр“. У 1926-м драматург апынаецца ў Менску, але тут яму працаваць не выпадае. Аляхновіча арыштоўваюць і высылаюць на Салавецкія выспы. Праз сем гадоў Саветы абмяняюць Аляхновіча на зняволенага ў Польшчы Браніслава Тарашкевіча і драматург зноў апынецца ў роднай Вільні. ¨н адразу піша кнігу “У кіпцюрох ГПУ“, якая па свежых слядах перакладаецца на сем еўрапейскіх моваў і першая распавядае свету праўду пра камуністычны рай. У часе апошняй вайны Аляхновіч працаваў у Беларускім нацыянальным камітэце ў Вільні. Тут ён і быў застрэлены на сваёй кватэры, як пішуць энцыклапедыі, ці то савецкімі, ці то польскімі партызанамі. Таямніца таго здарэння застаецца. Зрэшты, маглі яго ліквідаваць і немцы, і хто заўгодна. Бо не было тады такой сілы, якая б не супрацьстаяла беларускаму адраджэнцу. Усе чужыя былі настоеныя варожа.

9 сакавіка 1890г. нарадзіўся **Вячаслаў Молатаў,** савецкі кіраўнік, апошні з кагорты Сталіна. Гэта Молатаў, будучы міністрам замежных справаў СССР, падпісаў разам з міністрам замежных справаў Нямеччыны Рыбентропам сумнавядомы пакт і сакрэтныя пратаколы да яго. Цікава, што пры Хрушчове Молатава выключылі з партыі за ягоную прасталінскую дзейнасць, і далей увесь час савецкі пенсіянер Молатаў падаваў просьбы, каб яго ў партыі аднавілі. Але ні Брэжнеў, ні Андропаў на гэта не пагадзіліся. І толькі добры Канстанцін Чарненка прыняў ва ўлонне партыі заблукалага сына. Пасля гэтага ў служкі тырана на душы стала так спакойна, быццам яму адпусцілі ўсе грахі, і адыйшоў ён з гэтага свету чысты, нібы анёл. Верагодна ўжо сённяшняму маладому пакаленню таго молатаўскага шчасця не зразумець.



9 сакавіка 1918г. Выканаўчы Камітэт Рады Усебеларускага З’езду прымае **Другую Устаўную грамату.** Беларусь абвяшчаецца Беларускай Народнай Рэспублікай, дэмакратычнай, парламенцкай і прававой дзяржавай. Заканадаўчая ўлада ў БНР перадаецца Радзе Усебеларускага З’езду, а выканаўчая – Народнаму Сакратарыяту Беларусі. Абвяшчаецца нацыяналізацыя зямлі, яе нетраў, лясоў і азёр. Як падумаеш, дык яшчэ і сёння ў Беларусі няма такой яснай палітычнай схемы. Праўда, і Другая Устаўная грамата была яшчэ не апошняй у свой час. У ёй не вызначаная дакладная тэрыторыя дзяржавы і характар дачыненняў БНР да іншых дзяржаваў.

9 сакавіка 1934г. нарадзіўся **Юрый Гагарын,** касманаўт, першы чалавек у космасе. Цікава, што Гагарын, ураджэнец Смаленшчыны, лічыў сябе беларусам і напамяць расказваў запомнены з дзяцінства вершык Янкі Купалы “Хлопчык і лётчык“. У космасе ён адзін раз абляцеў Зямлю і прабыў у цэлым 108 хвілінаў – ад узлёту да пасадкі. Пасля ездзіў па свеце, дзе шчаслівыя натоўпы сустракалі яго ледзьве не як пасланца нябёсаў. Загінуў Гагарын у авія-катастрофе, калі выпрабоўваў новы самалёт.

9 сакавіка 1953г. у Маскве хаваюць Сталіна. Тысячы людзей прыйшлі паглядзець на любімага правадыра. Многія зі іх загінуць у цісканіне на Краснай плошчы. Цела дыктатара размяшчаюць у Маўзалеі, над уваходам якога побач са словам “Ленін“ зяўляецца другое імя – “Сталін“. Пазней цела апошняга вынесуць з маўзалея. А сёння ў Расеі не перапыняецца кампанія за тое, каб вынесці і першага.

**(Заканчэнне на с.8)**

# САКАВІК –

(Заканчэнне. Пачатак на с.5)

## 13 САКАВІКА

13 сакавіка 1938г. **расейская мова** ўводзіцца як абавязковы прадмет для вывучэння ў савецкіх школах.

## 14 САКАВІКА

14 сакавіка 1804г. нарадзіўся славуты аўстрыйскі кампазітар **¨ган Штраўс.** Калі Штраўсу было 20 гадоў, ён арганізаваў уласны танцавальны аркестр і пачаў разам з ім гастраляваць у Еўропе. Пасля яго зрабілі кіраўніком прыдворнага бальнага аркестру ў Вене. Штраўс лічыцца стваральнікам новага кшталту вальса, так званага венскага. Але пісаў Штраўс не толькі вальсы, але і галопы, маршы, полькі, фантазіі.

А вось яшчэ адзін славуты ўраджэнец сённяшняга дня, якога можна назваць кампазітарам фізікі. Гэта **Альберт Эйнштэйн,** стваральнік тэорыі адноснасці, якая перавярнула ўяўленні пра свет. Нарадзіўся Эйнштэйн 14 сакавіка 1879г. у нямецкім горадзе Ульме, яго бацька меў невялікую краму. Маленькі Альберт быў сапраўдным вундэркіндам. Хутка вывучыўся на прафесара. Але прыход да ўлады фашыстаў змусіў Эйнштэйна пакінуць Нямеччыну ў 1933г. ¨н перабраўся ў ЗША і да канца жыцця працаваў у Прынстанскім універсітэце. Яшчэ ў 1921г. А.Эйнштэйн быў узнагароджаны Нобелеўскай прэміяй.

14 сакавіка 2000г. **Папа рымскі Ян Павал ІІ** зрабіў беспрэцэдэнтны крок. ¨н папрасіў прабачэння ў Госпада Бога і вернікаў за ўсе тыя грахі і памылкі, якія каталіцкая царква ўчыніла за сваю 2000-гадовую гісторыю. Упершыню ў гісторыі кіраўнік Касцёла прасіў дарунку за грахі перад габрэямі, жанчынамі, ерэтыкамі і паганцамі, якіх на працягу стагоддзяў палілі на вогнішчах, забівалі, сілком хрысцілі, выганялі з дамоў і ўсяляк праследавалі.

## 15 САКАВІКА

15 сакавіка 44г. да нараджэння Хрыста пакінуў гэты свет рымскі дыктатар і паўкаводзец **Гай Юлій Цэзар.** Паходзіў імператар з патрыцыянскай сям“і, якая на той час страціла і багацце і ўплыў у грамадстве. Бацька яго памёр рана і адукацыяй сына займалася маці. Яшчэ ў юнацтве Цэзар вырашыў стаць палітыкам. ¨н прагнуў змяніць навакольны свет і тагачасны Рым. Гэта ён перайшоў Рубікон у часе паходу супраць барбараў, і адкрыта супрацьпаставіў сябе ўладам тагачаснага Рыму. Цэзара шанавалі за розум, мужнасць і прамоўніцкія здольнасці. Гэта яму належыць выказванне: “Прыйшоў, убачыў, перамог“. Зрабіўшыся рымскім імператарам, Цэзар мог нарэшце заняцца рэформамі, але неўзабаве быў забіты ў выніку змовы сенатараў. У той змове браў удзел і нярodны сын Цэзара Брут. Сенатары вырашылі, што кожны з іх ударыць імператара нажом, каб падзяліць адказнасць за забойства. Калі яны акружылі Цэзара, ён нават не супраціўляўся. І толькі пабачыўшы сына, які замахнуўся кінжалам, дакорліва прамовіў: “І ты, Брут...“.

15 сакавіка 1994г. была прынятая **Канстытуцыя РБ.** Першая канстытуцыя незалежнай Беларусі. Менавіта тая канстытуцыя ўводзіла ў краіне пасаду прэзідэнта, але не давала ніякіх гарантый ад аўтарытарнай мадэлі ўлады. Памылка выявілася неўзабаве. Прыйшоўшы да ўлады ў тым самым 1994 годзе, Аляксандр Лукашэнка ператварыў прававую дзяржаву ў адзін вялікі саўгас і сканцэнтраваў усю ўладу ў сваіх руках, змяніў пад свой густ усё, у тым ліку і канстытуцыю, чым працягнуў свае паўнамоцтвы на два гады.

## 16 САКАВІКА

16 сакавіка 1890г. у Дзвінску нарадзіўся **Саламон Міхоэлс,** тэатральны акцёр і рэжысёр, які ў сталінскія часы стаў галоўным савецкім габрэем. У часы другой Сусветнай вайны Міхоэлс узначаліў Габрэйскі антыфашысцкі камітэт, які апынуўся ў самым эпіцэнтры сусветных падзей, звязаных з габрэямі. З аднаго боку, адбываўся генацыд габрэяў на акупаваных немцамі тэрыторыях, з другога — выношваліся планы стварэння Ізраіля, з трэцяга — рабіліся праекты габрэйскай аўтаноміі за Байкалам і ў іншых месцах Савецкага Саюза. Напрыклад, меркавалася стварыць нейкую габрэйскую адміністрацыйную адзінку з цэнтрам у Гомелі. Вось жа ў 1948г. на ўрачыстым габрэйскім сходзе Міхоэлс радасна паведаміў пра шырокія магчымасці, якія савецкая ўлада дае для стварэння габрэйскай дзяржавы. Сталін расцаніў гэтыя словы як заклік да эміграцыі ў Ізраіль і адразу ж даў загад забіць Міхоэлса. На той момант акцёр знаходзіўся ў Менску. Тут, на адной менскай вуліцы і быў інсцэніраваны аўтамабільны наезд. Міхоэлс загінуў. А праз два месяцы пасля гэтага было абвешчана пра стварэнне дзяржавы Ізраіль.

16 сакавіка 1928г. у Вільні загінуў **Міхаіл Гурын-Маразоўскі.** Гэты чалавек быў прафесійным палітыкам, камуністам, які ў міжваеннай Вільні дзейнічаў пераважна на нелегальным становішчы. Штосьці там у іх у падполлі не заладзілася, нехта сказаў, што Гурын-Маразоўскі — правакатар, хтосці прапанаваў яго забіць. Прысуд выканаў Сяргей Прытыцкі проста ў зале Віленскага гарадскога суда. Цікава, што сёння ў беларускай энцыклапедыі ёсць артыкулы і пра Гурына-Маразоўскага і пра Прытыцкага як пра выдатных дзеячоў беларускай гісторыі.

## 17 САКАВІКА

17 сакавіка 1746г. нарадзіўся кампазітар **Ян Голанд.** На запрашэнне князёў Радзівілаў Голанд прыбыў з Нямеччыны ў Нясвіж і стаў тут прыдворным капельмайстрам і кампазітарам. У Нясвіжы Голанд напісаў і паставіў оперу “Агатка, або Прыезд пана“, оперу-вадэвіль “Чужое багацце нікому не на карысць“, балет “Арфей у пекле“ ды іншыя. Дата лішні раз нагадвае нам пра заняпад культуры ў беларускай правінцыі. Дзе цяпер у Нясвіжы прафесійны тэатр, які б ставіў оперы і балеты! А калісьці такіх мястэчак з тэатрамі ў нашым краі было шмат. Напачатку XIX ст. Ян Голанд пасяліўся ў Вільні і больш за дваццаць гадоў выкладаў у Віленскім універсітэце.

17 сакавіка 1789г. нарадзіўся філосаф **Вінцэнт Бучынскі.** ¨н быў прафесарам філасофіі Полацкай езуіцкай акадэміі, заснавальнікам і рэдактарам першага ў Беларусі літаратурна-навуковага часопіса “Полацкі штомесячнік“, які пачаў выходзіць у 1818г. А яшчэ Бучынскі напісаў працу “Філасофскія разважанні“, якая складалася з трох тамоў, кожны з якіх быў прысвечаны адпаведна логіцы, метафізіцы і этыцы.

## 19 САКАВІКА

19 сакавіка 1629г. нарадзіўся расейскі цар **Аляксей Міхайлавіч.** У расейскай гісторыі ён быў празваны “ціхайшым і дабрэйшым“. Што да Беларусі, дык нашы продкі зведалі Аляксея Міхайлавіча як пэўнага рэкардсмена сярод расейскіх цароў у вынішчэнні беларускага народу. Менавіта за гэтым царом у часе нападаў на Вялікае Княства Літоўскае, быў забіты кожны другі насельнік нашага краю. У параўнанні з гэтай статыстыкай XVII ст. блякне нават статыстыка апошняй вайны, калі загінуў кожны чацвёрты. Гісторык Генадзь Сагановіч піша: “Ваяўнікі Аляксея Міхайлавіча аднолькава бязлітасна чынілі гвалт над усімі, хто трапляўся, не зважаючы на веравызнанне, рабавалі, хапалі ў палон і выводзілі ў сваю дзяржаву. Беларускія сяляне з першых месяцаў вайны пачалі ўтвараць аддзелы самаахова. На акупаваных землях яны сыходзілі ў лясы, узбройваліся косамі, віламі, бердышамі ды спрабавалі абараніць ад чужынцаў свае пасяленні, перашкаджалі выводзіць мясцовых людзей у няволю, а таксама дапамагалі войску сваёй дзяржавы і часам уступалі ў адкрыты бой з рэгулярнай арміяй Аляксея Міхайлавіча. Так пачаўся шырокі партызанскі рух - першы ў беларускай гісторыі масавы добраахвотны рух супраціву, фактычна абарончая вайна народа. Народная барацьба хутка ахапіла амаль усю тэрыторыю Беларусі і трывала да самага вызвалення краю“. Выглядае, што традыцыі беларускай партызанкі бяруць пачатак не з нямецкай ці французскай, а з маскоўскай акупацыі нашага краю ў XVII ст.



19 сакавіка 1887г. памірае **Юзаф Крашэўскі** – пісьменнік і гісторык, які належыць да польскай літаратуры, але паходзіць з беларускай шляхты з Пружан і ўсю сваю творчасць прысвяціў вывучэнню роднага краю. Вучыўся Крашэўскі ў Свіцлацкай гімназіі і ў Віленскім універсітэце. У сярэдзіне XIX ст. ён быў рэдактарам віленскага часопіса “Атэнэум“. Напісаў ажно 223 раманы, мабыць лёгка яму тое давалася. А яшчэ ж пісаў паэмы, вершы, навуковыя працы ды падарожныя нататкі. Мабыць, каб столькі ўсяго стварыць, трэба ўсё жыццё тым толькі і займацца, што пісаць, пісаць, пісаць.

19 сакавіка 1900г. нарадзіўся **Фрэдэрык Жоліа-Кюры,** французскі фізік, нобелеўскі лаўрэат у галіне хіміі. У 1926г. Фрэдэрык ажаніўся з дачкою П’ера і Марыі Кюры і стаў насіць падвойнае прозвішча. У выніку атрымалася, што сям“я Кюры — адзіная, якая дала свету чатырох лаўрэатаў Нобелеўскай прэміі, што заслужылі пяць узнагарод.

19 сакавіка 1931г. нарадзіўся беларускі гісторык літаратуры **Генадзь Кісялёў.** Кісялёў напісаў шмат кніг па гісторыі беларускай культуры XIX ст., фактычна адкрыў для Беларусі гэтае стагоддзе на высокім акадэмічным узроўні. Мы ўпершыню атрымалі поўную карціну гісторыі Яна Чачота і філаматаў, Кастуся Каліноўскага і паўстання 1863 года, Францішка Багушэвіча ды іншых пачынальнікаў сучаснай беларушчыны.

## 20 САКАВІКА

20 сакавіка 1440г. загінуў **Жыгімонт Кейстутавіч,** які восем гадоў быў Вялікім князем Вялікага Княства Літоўскага. Жыгімонт быў родным братам Вітаўта. На вялікакняскі трон яго пасадзілі магнаты-каталікі. А ён, каб схіліць на свой бок праваслаўных князёў, пачаў выдаваць для іх прывілеі, гарантаваў іх недатыкальнасць і вызваліў ад павіннасцяў і плацяжоў з маёнткаў. З іншага боку Жыгімонт задобрываў і Польшчу, аддаўшы ёй Валынь і Падолію. Такая непаслядоўная і кампрамісная палітыка выклікала незадаволенасць іншых феадалаў і Жыгімонт Кейстутавіч быў забіты князямі Чартарыйскімі ў выніку змовы. Акурат у такі самы сакавіцкі дзень...

20 сакавіка 1661г. пакінуў гэты свет слаўны ваяка **Рыгор Мірскі,** найбольш вядомы прадстаўнік шляхецкага роду Мірскіх у Вялікім княстве Літоўскім. Рыгор быў палкоўнікам і першым стражнікам літоўскім. Удзельнічаў у войнах з туркамі, калі ажно двойчы трапляў у палон, а таксама з Масковіяй і мяцежнымі казакамі. Служыў Рыгор у Януша Радзівіла.

# ЧАС АБУДЖЭННЯ

20 сакавіка 1853г. з’явіўся на свет знакаміты мастак **Вінсэнт Ван Гог.** Цікава, што мастаком Ван Гог стаў толькі ў трыццаць гадоў і за сем гадоў напісаў больш за 800 карцін, праўда, пры жыцці прадалася толькі адна ягоная карціна.



20 сакавіка 1862г. ў Халопенічах нарадзіўся **Адам Багдановіч,** беларускі этнограф, бацька паэта Максіма Багдановіча. Адам Багдановіч нашмат пераажыў свайго геніяльнага сына, ад чаго моцна пакутаваў і скардзіўся, што яму даводзіцца пісаць успаміны пра Максіма, а не наадварот. Быў ён чалавекам амбітным і не надта верыў у будучыню беларушчыны. Аднак паспеў перакаанацца ў марнасці свайго недаверу на прыкладзе сына.

20 сакавіка 1897г. нарадзіўся **Мікалай Гікала.** Яго імя дагэтуль носіць вуліца ў Менску. Між тым, паходзіў Гікала з Адэсы, працаваў пасля бальшавіцкай рэвалюцыі, як кажуць, на партыйнай рабоце на Каўказе, у Сярэдняй Азіі і ў Маскве. У 1930-я гады яго прысылаюць кіраўніком кампартыі ў Беларусь. Тут Гікала становіцца арганізатарам масавых камуністычных рэпрэсій супраць мірнага насельніцтва. З 1932 да 1937 года менавіта ён кіраваў рэспублікай і адпаведна — арыштамі, высылкамі і расстрэламі народу, татальным вынішчэннем нацыянальнай інтэлігенцыі. Калі сёння некаторыя пісьменнікі вобразна кажуць, што ў 1937-м годзе беларускаму народу адсеклі галаву, дык кіраваў гэтым адсячэннем непасрэдна пасланец партыі Мікалай Гікала.

## 22 САКАВІКА



22 сакавіка 1786г. нарадзіўся **Яўхім Лялевель,** знакаміты гісторык і грамадзкі дзеяч. Дарэчы, маці Лялевеля Шалюта паходзіла з Беларусі. Сам ён скончыў Віленскі універсітэт, дзе пасля меў кафедру гісторыі. Калі расейскія ўлады раскрылі студэнцкія таварыствы філаматаў і філарэтаў, кафедру ў Лялевеля адабралі, бо ён быў ідэйным натхняльнікам студэнтаў. Тады ён бярэ ўдзел у паўстанні 1831 года, займаецца арганізацыйнай працай па-за радзімай, у Парыжы і Брюселі. А пахаваны Лялевель у Вільні, на могілках Роса. У сваіх гістарычных працах ён шмат пісаў пра нацыянальныя правы беларусаў і літоўцаў.

22 сакавіка 1864г. у Вільні на Лукіскім пляцы мураўёўцы павесілі **Кастуся Каліноўскага.** Цяпер на месцы гібелі змагара ёсць мемарыяльная табліца. Але дакладнае месца пахавання Каліноўскага невядомае. ¨сць звесткі, што магіла яго – недзе ў замкавай Гедымінавай гары. Нібыта яшчэ ў міжваенны час удзячныя нашчадкі паставілі на тым месцы крыж. Але цяпер ад таго крыжа не засталося ані знаку.

22 сакавіка 1882г. у Будславе нарадзіўся **Эдзюк Будзька** — беларускі паэт, публіцыст, грамадскі дзеяч. Будзька вучыўся ў Рыжскай палітэхніцы, а друкаваўся ў віленскай “Нашай Ніве“, пасля патрапіў у Петраград, у 1917 годзе быў дэлегатам Усебеларускага з”езду, а ўжо праз год у родным Будславе арганізаваў беларускую гімназію. У Другую Сусветную вайну ён настаўнічаў у Менску і Баранавічах, з набліжэннем савецкіх войск перабраўся спачатку ў Нямеччыну, а пасля ў ЗША, дзе і памёр у 1958 годзе.

22 сакавіка 1921г. у Вільні выйшаў 1-ы нумар газеты **“Беларускі звон“,** рэдактарам якой быў слынны драматург Францішак Аляхновіч.

22 сакавіка 1925г. памірае **Аляксандр Мяснікоў-Мяснікян** – першы кіраўнік савецкай Беларусі. ¨н умудраўся кіраваць рэспублікай беларусаў, пры гэтым адкрыта выступаючы супраць права беларусаў на сваю дзяржаўнасць і супраць самога існавання беларусаў, як самастойнай нацыі. Чалавек быў чужы, родам з Растова-на-Доне, у Менск быў прысланы з Масквы.



22 сакавіка 1943г. гітлераўцы спалілі беларускую вёску **Хатынь** разам з людзьмі. А была гэта невялікая вёска, 26 двароў. Учыніў экзэекуцыю карны атрад эсэсаўцаў обэрштурмбанфюрэра Аскара Дзерлівангера. У агні згарэлі 149 хатынцаў, у тым ліку 75 дзяцей. Сёння на месцы спаленай вёскі збудаваны мемарыял. Хатынь – адна з многіх спаленых у вайну беларускіх вёсак. ¨сць меркаванне, што менавіта яна абраная за сімвал, бо яе назва сугучная з назваю Катыні на Смаленшчыне, дзе савецкія карнікі знішчылі тысячы польскіх афіцэраў. І зроблена гэта было, каб заблытаць звесткі – хто дзе калі і каго забіваў – і такім чынам зацерці праўду пра трагедыю Катыні. Трэба мець на ўвазе, што і за афіцыйнай легендай хатынскай трагедыі застаецца шмат няяснага. Гадоў дзесяць таму, калі паадкрываліся архівы, у друк патрапілі звесткі пра тое, што хатынцаў спалілі не немцы, а карны ўкраінскі батальён. Сталі вядомыя і некаторыя дэталі трагедыі. Напярэдадні здарэння савецкія партызаны на дарозе каля Хатыні забілі нямецкага афіцэра, любімчыка Гітлера. Вось жа спаленне вёскі фашыстамі было наўпрост справакаванае так званымі народнымі мсціўцамі... Так ці інакш, а поўная праўда пра хатынскую трагедыю яшчэ не распаведзеная. Бясспрэчным застаецца і застанецца толькі факт злачынстваў, якім не будзе тэрміну даўнасці.

## 25 САКАВІКА

25 сакавіка – найважнейшае свята ў гісторыі незалежнай Беларусі. Менавіта ў гэты дзень у 1918г. у Менску была **абвешчана незалежнасць Беларускай Народнай Рэспублікі.** Цікава, што Трэцяя Ўстаўная Грамата была прынятая з ініцыятывы Віленскай Беларускай Рады на чале з Антонам Луцкевічам. Пакуль менскія беларусы яшчэ крыху вагаліся, віленскія рашуча настойвалі на поўнай незалежнасці краіны.



Паштоўка БНР

Цяпер Беларусь мусіла сама стварыць свае органы ўлады і ўсталяваць міжнародныя дачыненні з іншымі краінамі.

У Грамаце названыя канкрэтныя тэрыторыі, якія павінны ўвайсці ў склад БНР: Магілёўшчына, Меншчына, Гарадзеншчына (з Горадняй і Беластокам), Віленшчына, Віцебшчына, Смаленшчына, Чарнігаўшчына і сумежныя часткі суседніх губерняў, заселеныя беларусамі (меліся на ўвазе часткі Сувалкаўскай і Ковенскай губерняў).

З тых часоў і да сёння 25 сакавіка – найважнейшае нацыянальнае свята свядомых беларусаў ва ўсім свеце. У гэты дзень праводзяцца ўрачыстыя набажэнствы і акадэміі, а ў Менску ды іншых гарадах Беларусі апошнія 10 гадоў людзі выходзяць на святочныя дэманстрацыі і мітынгі.

25 сакавіка 1957г. быў падпісаны **Рымскі трактат,** паводле якога стварылася Еўрапейская Эканамічная Супольнасць, якую часта называюць Супольным Рынкам. Трактат падпісалі шэсць краін: Бельгія, Францыя, Нямеччына, Італія, Люксембург і Галандыя.

## 28 САКАВІКА



28 сакавіка 1985г. пакінуў гэты свет **Марк Шагал,** знакаміты беларускі мастак.

Нарадзіўся ён 7 ліпеня 1887г. у Віцебску дзевятым у сям’і. Яго бацька працаваў на складзе, дзе капцілі сялёдку, а маці трымала лаўку, у якой прадавалася гэтая самая сялёдка. Тым не менш, з хлопца выйшаў выдатны, сусветна вядомы творца, большая частка жыцця якога прайшла, на жаль, па-за межамі Беларусі. Прыняўшы бальшавіцкі пераварот з энтузіязмам (быў нават два з паловай гады камісарам па культуры ў Віцебску, спрабаваў арганізоўваць разнастайныя выставы, адкрываць музеі і школы), у хуткім часе расчараваўся ў камуністычнай ідэі і эміграваў. Жыў ён і ў Берліне, і ў Парыжы, і ў Нью-¨рку. Быў двойчы жанаты. А пайшоў з жыцця на французскай Рыв’еры, дзе жыў апошнія гады.

**Гістарычны сектар**

АБ'ЯВЫ

# ІНДЫВІДУАЛЬНЫЯ ДАСЛЕДЧЫЦКІЯ ГРАНТЫ АД ФОНДУ МАКАРТУРАЎ

Да 15 чэрвеня 2002 года працягваецца прыняцце заяваў на індывідуальныя даследчыцкія гранты Фонду Макартураў, што выдзяляюцца ў рамках Ініцыятывы па прадастаўленні грантаў для фінансавання праектаў у незалежных дзяржавах былога СССР.

Мэта конкурсу - падтрымка арыгінальных наватарскіх навуковых працаў і аналітычных даследаванняў, што маюць практычнае прымяненне, а таксама важных для выпрацоўкі палітычных падыходаў да рашэння актуальных грамадскіх праблемаў у рэгіёне. Ініцыятыва зарыентаваная на падтрымку тых даследчыкаў, якія мяркуюць не толькі атрымаць новыя веды, але і практычна садзейнічаць рашэнню пастаўленых грамадскіх праблемаў. Праекты, пададзеныя на конкурс індывідуальных даследчыцкіх працаў, павінны супадаць з адной з прыярытэтных галінаў праграмы Фонду: правы чалавека (абарона грамадзянскіх правоў, эканамічныя і сацыяльныя правы, маніторынг парушэнняў правоў чалавека, правы жанчын і меншасцей і інш.), навакольнае асяроддзе і грамадства (устойлівае развіццё, падтрымка біяразнастайнасці, удзел грамадскасці ў захаванні экасістэмаў, эфектыўная вытворчасць і выкарыстанне энергіі і інш.), свет і бяспека (шырокія канцэпцыі бяспекі, кантроль над узбраеннямі і раззбраенне, распаўсюджванне ўзбраенняў і рэгіянальныя канфлікты і інш.).

Да разгляду не прымаюцца: праекты, што прадугледжваюць удзел больш чым аднаго чалавека; праекты, што з'яўляюцца часткай планавых працаў навуковых калектываў; тэарэтычныя працы ў галіне фізічных, хімічных і біялагічных навук; заявы на выданне ўжо падрыхтаваных манаграфій; праекты на выданне і распаўсюджванне газетаў і часопісаў; праекты, звязаныя з завяршэннем кандыдацкіх дысертацый; праекты па стварэнні камп'ютэрных базаў дадзеных, што не маюць даследчыцкіх кампанентаў.

Сродкі могуць запрошвацца на абсталяванне і матэрыялы, аплату выдаткаў на камандзіроўкі ў сувязі з праектам і іншыя выдаткі. Паездкі за межы дзяржавы не павінны займаць больш, чым трэціну ўсяго часу працы над праектам. Кожны ўдзельнік мае права падаваць на конкурс толькі адзін праект.

Працягласць праекта - да 18 месяцаў, з пачаткам працы па гранту не раней чэрвеня кожнага года. Заява падаецца ў 5 (пяці) асобніках. Кожная заява павінна ўключаць: кароткія звесткі пра ўдзельніка конкурсу, апісанне праекта, дадатак (CV, публікацыі, рэкамендацыйныя лісты), каштарыс выдаткаў (да $17000). Заявы падаюцца на рускай альбо англійскай мовах.

Запоўненыя заявы і ўсе матэрыялы павінны быць атрыманыя чыкагскім ці маскоўскім аддзяленнем Фонду Макартураў да 15 чэрвеня (уключна) 2002 года. Заявы, напісаныя ад рукі, а таксама адпраўленыя факсам ці электроннай поштай, не будуць прынятыя да разгляду. Вынікі разгляду праектаў стануць вядомыя ў лютым 2003 года.

Дадатковую інфармацыю і форму заяваў можна атрымаць: MacArthur Foundation Initiative in the Independent States of the Soviet Union, 140 South Dearborn St., Suite 1100 Chicago, IL 60603 USA. Tel.: (312) 726-80-00, fax: (312) 917-02-00, http://www.macfound.org

Прадстаўніцтва Фонду Макартураў у Расіі: Россия, 121069, Москва, Хлебный пер., 8, этаж 2. Тел.: (095) 737-0015, факс: (095) 956-6358. E-mail: moscow@macfound.org, http://www.macfound.ru.

# ПРАГРАМА МАЛЫХ ГРАНТАЎ АД IUCN/ФОНДУ ФОРДА

Падраздзяленне арганізацыі IUCN, што займаецца праблемамі ўстойлівага развіцця рэсурсаў і дзейнічае ў межах грантаў ад Фонду Форда, прапануе малыя гранты для прасоўвання галіны даследавання ўстойлівага выкарыстання біялагічных сістэмаў.

Мэта праекта - прасоўванне аўтарытэта навукі краінаў у стадыі развіцця і садзейнічанне навуковаму абмену. У 2002 годзе перавага будзе нададзеная праектам, што раскрываюць складаныя сувязі паміж чалавекам і прыродай, даследуючы канцэпцыю ўстойлівасці. У першую чаргу будуць прафінансаваныя заявы, прысвечаныя інавацыйным дысцыплінам ці шматдысцыплінарным падыходам да вырашэння праблем.

Падтрымка будзе забяспечаная толькі ў адной катэгорыі штогод: удзел у адукацыйных і тэхнічных сустрэчах (звычайна ўключае выдаткі на падарожжа, кішэнныя грошы і некаторыя іншыя тэхнічныя выдаткі). Максімальная сума гранта - $2000. У цэлым, праграма прызначаная для падтрымкі і распаўсюджання навуковых адкрыццяў, праектных распрацовак і вынікаў даследаванняў, праведзеных у краінах, якія сталі на шлях развіцця.

Не будуць прафінансаваныя: заявы на гранты для правядзення даследаванняў; заявы для ўдзелу ў трэнінгах і курсах; заявы ад індывідуалаў з краінаў, што развіваюцца. Заявы будуць разглядацца пакварітальна: апошнія тэрміны - 31 сакавіка і 30 чэрвеня.

Для ўдзелу ў праграме неабходна даслаць ліст каардынатару праграмы малых грантаў з абавязковым пазначэннем бюджэту, з указаннем усіх выдаткаў, а таксама іншых крыніцаў фінансавання; апісаннем сустрэчы (з датамі) і ролі асобы, што падае заяву, у гэтай сустрэчы (неабходна ўлічваць, што гранты не будуць прадастаўленыя пасіўным удзельнікам сустрэчы); назвай і апісаннем прэзентацыі заяўніка, у выпадку, калі ў заяве ідзе гаворка пра прэзентацыі; тлумачэннем, чаму від дзейнасці, пра які ідзе гаворка ў заяве, важны для навукі; апісаннем сувязей з відамі і праектамі IUCN, калі ёсць.

Кантакты для падачы заяваў і атрымання больш падрабязнай інфармацыі: Ruth Bareto, IUCN/Ford Foundation Small Grants Coordinator, IUCN Sustainable Use Team, 1630 Connecticut ave., Third Floor Washington, DC 20009 U.S.A.

**Tel.: +202 518 2063, fax: +202 387 4823, e-mail: rbarreto@iucnus.org www.iucn.org**

ДАРЭЧЫ

Сядзяць дзве бабулькі на ганку, грэюцца на вясеннім сонейку. Сядзяць, сядзяць, і вось адна кажа другой:

- Маня, штой-та тут падаллю смярдзіць. Маня?.. Маня?... МАНЯ?!

***

Жонка - мужу:

- Ты ведаеш, хутка ты будзеш бацькам!

Муж, цяжка апускаючыся на стул:

- Значыць, яна табе усёж-такі расказала...

***

Ідуць два хлопцы па вуліцы:

- О, мне, здаецца, дзяўчынка ўсміхнулася!

- Ды ладна, я цябе калі першы раз убачыў, потым тыдзень смяяўся.

Адзін міліцыянт распавядае другому:

- Уяўляеш, напарнік мой аднойчы дахаты вяртаецца, а там - чужыя мужчынскія штаны!

- Ну, і што ён жонцы сказаў?!

- Сказаў: «Лепш бы ты мне здрадзіла! Але красці!!!»...

***

Прафесар ва універсітэце толькі што скончыў тлумачыць курсавую работу, якая павінна быць здадзена ў панядзелак да 12 гадзін. Таксама ён адзначыў, што існуе толькі дзве нагоды для затрымкі здачы работы: медыцынская даведка аб цяжкім захворванні альбо смерць каго-небудзь з сям'і студэнта. Адзін са студэнтаў з задняй парты падняў руку і спытаў:

-А як наконт экстрэмальнай сэксуальнай знясіленасці?

Як вы і чакалі, усе студэнты гучна заржалі. Калі гоман скончыўся, прафесар паглядзеў на студэнта, што задаў пытанне:

- У такім выпадку, - сказаў прафесар, - вам прыйдзецца навучыцца пісаць другой рукой.

***

Мужык ішоў да знаёмага ў госці - а там цэлая кодла наркаманаў у пад'ездзе...

Зарадзілі шпрыц нейкім чорным мутным рэчывам - і пускаюць яго па колу.

Мужык абалдзеў і пытае:

- Вы чаго, хлопцы - СНІДу не баіцеся?!

- Ды ты гоніш! Мы тут усе ў прэзерватывах!

***

Муж с жонкай ходзяць па крамах і ніяк не могуць падабраць мужу абутак.

Усё што не пamераюць - усё малое. Жонка ўжо кіпіць ад злосці, а муж апраўдваецца:

- Разумееш, у вёсцы рос... без абутку хадзіў...

- Лепш бы ты без трусоў хадзіў!

АБ'ЯВЫ

**Рэдакцыя бюлетэня "Дзедзіч" шукае распаўсюджвальнікаў выдання ў навучальных установах Берасця і вобласці. Тэл. (0162) 26-15-51.**

**Рэдакцыя бюлетэня «Дзедзіч» запрашае да супрацоўніцтва карэспандэнтаў з Берасця і гарадоў вобласці. Калі вы жадаеце выказаць свае думкі на нашых старонках, тэлефануйце: (0162) 26-15-51**

**ШАНОЎНЫЯ СЯБРЫ!**

**У Мерачоўшчыне (Івацэвіцкі р-н), недалёка ад Косаўскага палаца, у 2002 г. будуць праводзіцца работы па аднаўленні сядзібы Тадэвуша Касцюшкі. Будзе арганізаваны летні лагер для валанцёраў, жадаючых прыняць удзел у аднаўленні гістарычнага помніка.**

АБВЯШЧАЕМ НАБОР ВАЛАНЦЁРАЎ у летні лагер у Мерачоўшчыне.

**Калі вас зацікавіла наша прапанова і вы маеце вольны час у жніўні, звяртайцеся да нас. Тэл.: (0162) 26-15-51.**

## АБ'ЯВЫ

# ПРАГРАМА ГРАНТАЎ ПА РАЗВІЦЦІ ПАРТНЁРСТВА

Фонд Charity Know How (CKH) распачынае праграму малых грантаў (да $15000) на 2002 г. Праграма накіраваная на абмен досведам паміж грамадскімі аб'яднаннямі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і новых незалежных дзяржаваў. Праект павінен уключаць значныя элементы "ноу-хау" і можа ўключаць праграмы трэнінгаў для супрацоўнікаў і валанцёраў НДА, прафесійныя кансультацыі і навучальныя паездкі. У адпаведнасці з генеральнай праграмай, з'явіліся дзве новыя схемы: Глабальныя гранты (Global Grants), што садзейнічаюць сувязям паміж арганізацыямі ў Азіі, Афрыцы ці Лацінскай Амерыцы і Partnership Development Grants, якія накіраваныя на развіццё доўгатэрміновых партнёрскіх сувязей паміж НДА.

Праграма СКН не фінансуе: індывідуальныя праграмы, навучанне англійскай мове як замежнай ці іншыя студэнцкія праграмы, любое будаўніцтва ці фінансавыя затарты, затраты на перавозку гуманітарнай дапамогі ці медыцынскага абсталявання, унутраныя выдаткі, такія, як арэндная плата ці абсталяванне, а таксама культурны абмен.

Будуць праведзеныя два туры па грантах, з апошнім тэрмінам прыняцця аплікацыйных формаў 27 лютага і 27 жніўня.

Прыярытэты будуць аддавацца праектам па тэмах: міжнароднае супацоўніцтва ў межах наступных рэгіёнаў (Балканы і Карпаты, Каўказ, Цэнтральная Азія, СНД); супрацоўніцтва, пры якім уменні і "ноу-хау" перадаюцца ад больш вопытных менш вопытным НДА, нядаўна заснаваным арганізацыям. Больш падтрымліваецца супрацоўніцтва, што ўключае доўгатэрміновыя стасункі паміж арганізацыямі, чым кароткатэрміновае супрацоўніцтва, разлічанае на тэрмін дзеяння праекта.

**Больш дакладную інфармацыю і аплікацыйныя формы можна атрымаць на сайце www.allavida.org ці па e-mail: enquiries@allavida.org.**

# КОНКУРС СТЫПЕНДЫЙ ДЛЯ СТУДЭНТАЎ І АСПІРАНТАЎ

Упраўленне Вярхоўнага камісарыята ААН па справах бежанцаў і Міжнароднае грамадскае аб'яднанне па вывучэнні ААН і інфармацыйна-адукацыйных праграмах аб'яўляюць конкурс стыпендый для студэнтаў і аспірантаў, якія вывучаюць праблемы міжкультурных зносінаў, міграцыі і бежанцаў.

Мэтай конкурсу з'яўляецца матэрыяльная падтрымка таленавітых беларускіх студэнтаў і аспірантаў. Плануецца, што пераможцам конкурсу будзе выдзеленая штомесячная стыпендыя ў памеры 225 000 беларускіх рублёў на перыяд з верасня па снежань.

Да ўдзелу ў конкурсе запрашаюцца студэнты 1-4 курсаў і аспіранты 1-2 гадоў навучання (вочная форма навучання). Жадаючыя прыняць удзел у конкурсе павінны падаць у Міжнароднае грамадскае аб'яднанне па вывучэнні ААН **да 15 траўня 2002г.** запоўненую анкету ўдзельніка конкурсу і копіі сваіх лепшых прац па тэматыцы конкурсу (артыкулы, курсавыя працы, даклады, тэзісы альбо, калі такіх няма, сачыненні адвольнай формы, напісаныя спецыяльна да конкурсу). Пажадана, каб працы былі ўдрукаваным выглядзе на беларускай ці рускай мове на аркушах А4. Працы, накіраваныя на конкурс, не вяртаюцца. Стыпендыі будуць прысуджацца па выніках разгляду работ камісіяй, якая складаецца з прадстаўнікоў Упраўлення Вярхоўнага камісарыята ААН па справах бежанцаў і Міжнароднага грамадскага аб'яднання па вывучэнні ААН і інфармацыйна-адукацыйных праграмах. Пры неабходнасці магчыма правядзенне індывідуальнага субяседавання з аўтарамі лепшых прац. Плануецца выданне зборніка лепшых прац.

Дадатковую інфармацыю і анкету можна атрымаць па e-mail: cenunst@mailru.com. Тэл. у Мінску: 284-00-13.

Адрасы конкурсу ў інтэрнэце: www.cenunst.by.ru/students2002.shtml,
www.cenunts.bsu.by/students2002.shtml.

## КОНКУРС

# ХВОСТ ПІСТАЛЕТАМ ТРЫМАЙ, АЛЕ ПРА СНІД НЕ ЗАБЫВАЙ



Клуб "Дзедзіч" сумесна з ГА "Маладзёжны адукацыйны цэнтр "Фіяльта" ў рамках праграмы "Роўны навучае роўнага" абвяшчае конкурс на лепшы малюнак і эсэ (замалёўку) на тэму ВІЧ/СНІД.

Умовы конкурсу: Для напісання творчых прац мы прапануем некалькі тэмаў: "ВІЧ/СНІД у Рэспубліцы Беларусь", "Здаровыя і хворыя: этыка ўзаемаадносінаў", "Якую пагрозу нясе ВІЧ/СНІД?". Гэта могуць быць і Вашыя тэмы. Працы могуць быць як мастацкага, так і публіцыстычнага характару. Максімальны памер – адна старонка А4. Памер малюнкаў і тэхніка іх выканання не абмежаваныя.

Свае працы дасылайце, калі ласка, на адрас: 224000, г. Берасце, вул. Камуністычная, д. 2, кв. 12. Даведкі можна атрымаць па тэл.: (0162) 20-42-45.

Аўтары лепшых прац будуць узнагароджаныя каштоўнымі прызамі.




Сябрукі!

**Калі самотна?! Дам параду я ахвотна!**
**Кніжку добрую прыдбай – напаткаеш Зямны рай!**
**Трэба ў гэтым дапамога?! Вырушай хутчэй у дарогу,**
**Знайдзі дзядзьку Андруся – мара спраўдзіцца ўся!**

*Для каханай, ці малога, сваякоў, бацькоў ці Бога,*
*Адшукаеш кніжку ты – пасябруем назаўжды!*

Дзядзька АНДРУСЬ

**ПРАПАНУЕ** – шмат добрых беларускіх кніжак;
**ДАПАМОЖА** – адшукаць патрэбную кнігу;
**ЗЛАДЗІЦЬ** – на замову паважны кнігазбор;
**А ТАКСАМА** параіць, як пазбавіцца непатрэбных Вам кніг.



*Дзядзьку Андруся проста адшукаць на сядзібе "ВАРУТЫ" па адрэсе: д. 24, вул. Камсамольская, г. Баранавічы, тэл. 8 (0163) 41-70-57; 41-79-51*
**У выпадку маёй адсутнасьці пакіньце Вашыя кантакты.**
*Калі ласка! Заходзьце ды тэлефануйце!*
З павагаю, дзядзька Андрусь

*АБ'ЕКТЫЎНА ПРА РЭАЛЬНАЕ*
**RR**
**РАДЫЁ РАЦЫЯ**
***НА КАРОТКІХ ХВАЛЯХ***
*6035 кГц (49 м) 08:00-10:00*
*6180 кГц (49 м) 13:00-15:00*
*6050 кГц (49 м) 21:00-23:00*
***НА СЯРЭДНІХ ХВАЛЯХ***
*612 кГц (490 м) 07:00-11:00*
**WWW.RACYJA.PL**
*220102, Менск, а/с 144*

Берасцейскае абласное аддзяленне
**Грамадскага аб'яднання ПРАВААБАРОНЧЫ ЦЭНТР**
**«ВЯСНА»**
прапануе грамадзянам бясплатную прававую дапамогу.
(адміністратыўнае і грамадзянскае права, парушэнні правоў чалавека)
**Звяртайцеся на адрас:** г. Берасце, бульвар Шаўчэнкі, д. 7, кв. 24.
Тэл./факс: (0162) 20-13-95.


## ШАНОЎНЫ ЧЫТАЧ!

**Каб зрабіць наш бюлетэнь больш цікавым і прывабным для цябе і тваіх сяброў, мы звяртаемся да цябе з просьбай адказаць на гэтае пытанне і даслаць адказ на адрас: 224000, г. Берасце, вул. Камуністычная, д. 2, кв.12.**

Будзем вельмі ўдзячныя за тваю дапамогу ў стварэнні цікавай сучаснай газеты, а для лянівых паведамляем, што сярод тых, хто дашле нам свае заўвагі, мы разыграем 3 аўдыёкасэты з музыкай беларускіх гуртоў.

Чаго не хапае на старонках "Дзедзіча", якую інфармацыю ты хацеў бы атрымліваць праз яго: ______

## УВАГА!

Працягваецца бясплатная падпіска
**на Інфармацыйна-аналітычны бюлетэнь "Дзедзіч".**

Калі ты жадаеш атрымоўваць яго больш стала і аператыўна, запоўні гэты купон і дашлі яго на адрас:
**224000, г.Берасце, вул. Камуністычная,д. 2, к.12.**

Чаму ты вырашыў падпісацца: ______

Прозвішча: ______

Імя: ______

Імя па бацьку: ______

Паштовы адрас: ______

Тэлефон: ______

# «МІРНЫ АТАМ» ВАКОЛ БЕЛАРУСІ

НА БЕЛАРУСІ НЯМА АТАМНАЙ ЭНЕРГЕТЫКІ – РАЗМОВЫ ПРА ПАБУДОВУ СВАЁЙ “ПЕРШАЙ БЕЛАРУСКАЙ АЭС” “БЛАГАПАЛУЧНА” ЗАЦІХЛІ. АЛЕ Ў ГАДЫ СССР БУДАВАЛАСЯ, ЯК МАГА ХУТЧЭЙ И ТАННЕЙ, ШМАТ АТАМНЫХ ЭЛЕКТРАСТАНЦЫЙ, І БЕЛАРУСЬ ЗНАХОДЗІЦЦА Ў ВЕЛЬМІ НЕБЯСПЕЧНЫМ ІХ АТАЧЭННІ.

Побач з яе межамі паспяхова дзейнічаюць тры АЭС: з расейскага, літоўскага і украінскага бакоў. Яшчэ адна – сумнавядомая Чарнобыльская – зачынена ў 2000г., але ж не перастала пры гэтым быць небяспечнай. Спецыялісты з гэтых краінаў сцвярджаюць, што станцыі абсалютна надзейныя, але ж ці не пагражае радыяцыя Беларусі? Мы ўжо маем Чарнобыль.

Вялікая аварыя, якая адбылася 26 красавіка 1986г. на чацвёртым энергаблоку **ЧАРНОБЫЛЬСКАЙ АЭС** за 12 км ад паўднёвай мяжы рэспублікі, па маштабах складанасці і працяглых выніках з'яўляецца самай цяжкай катастрофай за ўсю сусветную гісторыю выкарыстання атамнай энергіі. Вялікая колькасць радыёактыўных рэчываў з разбуранага рэактара выбухам была выкінута ў атмасферу і пазней выпала “плямамі” на тэрыторыі Беларусі, Украіны і Расеі.

Беларусь стала зонай экалагічнага бедства, бо зоны радыёактыўнага забруджвання супалі ў некаторых раёнах з існаваўшымі раней зонамі высокага хімічнага забруджвання. Пасля аварыйнага выкіду значная частка радыёнуклідаў акумулявалася ў верхніх пластах глебы. Радыёнукліднае забруджванне зрабіла немагчымым нармальнае вядзенне лясной гаспадаркі і сельскагаспадарчай вытворчасці на працягу многіх дзесяцігоддзяў.

Чарнобыльская катастрофа нанесла вялікі ўрон беларускаму народу, закранула лёс мільёнаў людзей, 23% тэрыторыі краіны з 3678 населенымі пунктамі, у якіх пражывала больш за 2 млн. чалавек, былі забруджаныя радыёнуклідамі шчыльнасцю звыш 1 Кu/км$^2$ (па цэзію -137). У рэспубліцы радыёактыўнымі элементамі забруджана 1685 тыс. га лясоў; 1600 тыс. га сельскагаспадарчых зямель, з іх 260 тыс. га ворыўных зямель выключаны з сельскагаспадарчага выкарыстання.

Каб пазбегнуць далейшага распаўсюджвання радыяцыі ў 1986г. над выбухнуўшым энергаблокам быў пабудаваны бетонны саркафаг. За яго тоўстымі сценамі знаходзяцца яшчэ 170-200 тон ядзернага паліва. Але ж за 16 гадоў герметычнасць саркафага значна пагоршылася. Ужо ў гэтым годзе плануецца пачаць рэканструкцыю сховішча. Праца цяжкая і небяспечная: памылка – і зноў аблокі радыёактыўнага пылу ў паветры.

Зараз Украіна збіраецца будаваць два новыя рэактары на Хмяльніцкай і Ровенскай АЭС.

На **СМАЛЕНСКАЙ АЭС** “невялікая” праблема – не хапае грошаў. І некаторыя чыноўнікі з Міністэрства атамнай энергіі Расеі прапаноўваюць пакінуць у дзяржаўнай уласнасці толькі рэактары, а ўсю астатнюю інфраструктуру абмяняць на інвестыцыі. Міністр А.Румянцаў мяркуе на прыкладзе амерыканскіх АЭС правесці частковую прыватызацыю АЭС і ў Расеі. Але ведаючы, як і якія змены ўладальніка адбываюцца на прадпрыемствах Расеі – забойствы, страляніна, захоп кабінетаў – не вельмі хочацца, каб тое ж тварылася і на атамных аб'ектах.



Чацвёрты блок Чарнобыльскай АЭС

Нядаўна стала вядома, што на Смаленскай АЭС ужо адбылася частковая прыватызацыя. А вось цяпер Генеральная пракуратура РФ патрабуе яе адмяніць і вярнуць маёмасць у дзяржаўную ўласнасць. Крымінальная справа ўзбуджана, але працэс вяртання назад ідзе вельмі марудна. Што адбудзецца далей на гэтай АЭС – невядома.




**Словы з гімна СССР на сцяне дома ў горадзе-прывідзе Прыпяць, насельніцтва якога (30 тыс.) было эвакуявана пасля трагедыі на ЧаАЭС**

**ІГНАЛІНСКАЯ** атамная электрастанцыя (Літва) знаходзіцца ўсяго за чатыры кіламетры ад беларускай мяжы. У яе той-жа тып, што і ў Чарнобыльскай АЭС. Таму еўрапейская супольнасць патрабуе ад сейма Літвы закрыцця Ігналінскай АЭС. Але тэрміны закрыцця дагэтуль не вызначаныя – Літва папярэдне жадае атрымаць пэўныя гарантыі адносна закрыцця першага блоку.

Літва жадае атрымаць дакладны план фінансавай дапамогі, які б улічваў усе аспекты працэсу закрыцця. У тым ліку – гарантыі далейшай занятасці цяперашніх супрацоўнікаў Ігналінскай АЭС, што жывуць у горадзе Вісагінас і ў Ігналінскім раёне. Адсутнасць сацыяльных гарантыяў ужо цяпер стварае пагрозу для бяспекі АЭС.

Літве вельмі нявыгадна губляць крыніцу таннай электраэнергіі, Еўропа хоча “спаць спакойна” – кампраміс, як заўсёды, у грошах. Беларускі інтарэс у тым, каб Ігналінская АЭС была хутчэй зачынена і закансервавана так, каб не ствараць атамнай небяспекі.

Такім чынам, нам застаецца жыць спакойна і спадзявацца на лепшае – другога Чарнобыля не будзе. З першым бы разабрацца.

**Д. ДЗІКІ**

**Фота: IREX/ProMedia**

## ДАРЭЧЫ

- Хлопцы, а вы ведаеце, што стакан смятаны замяняе 5 хвілін смеху?

- Так? Ну ідзі і сама палі сваю смятану!

***

Размаўляюць два сябра... Адзін другому, заклапочана:

- Ніяк не магу прыдумаць, што падарыць сваёй сяброўцы на 8-ае сакавіка...

Другі, задуменна:

- А калі ў яе 8-ае сакавіка?

Памірае мужык ад прастуды і просіць доктара:

– Слухай, я табе яшчэ і заплачу, толькі напішы мне, што я памёр ад СНІДу.

Доктар: Навошта?!!

Мужык: Па-першае сябе рэабілітуеш - СНІД не вылечваецца, да маёй сцервы больш ніхто пальцам не дакранецца, а той кабель, што ўжо 5 гадоў з ёй спіць, дакладна павесіцца!.

***

Мужчына заходзіць у краму, дзе прадаюць кветкі і просіць: – Падбярыце мне, калі ласка, сто ружаў для маёй жонкі.

Прадаўшчыца з жахам:

- Бог мой! Што ж вы такога нарабілі?!

***

Адзін шабашнік слаў лінолеум у хаце. Паслаў і захацеў папаліць. Глядзіць: цыгарэты з пярэдняй кішэні зніклі. Кінуўся шукаць - нідзе няма. Потым бачыць - пад лінолеумам шышка. Ну думае, не будзеш жа з-за адной пачкі лінолеум ад-дзіраць. Узяў малаток і грукнуўшы пару разоў зраўняў месца. Заходзіць гаспадыня кватэры і кажа:

- Вось вашы цыгарэты. Вы іх у калідоры абранілі. Дарэчы, вы не бачылі майго хамячка....???

№ 2 ДЗЕДЗІЧ
ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ
ñàêàâ³ê 2002

ПРЫ ВЫКАРЫСТАННІ МАТЭРЫЯЛАЎ БЮЛЕТЭНЯ СПАСЫЛКІ НА КРЫНІЦУ АБАВЯЗКОВЫЯ

Рэдакцыя можа не падзяляць меркаванні аўтараў і друкаваць артыкулы для далейшай палемікі

СКЛАДАЕМ ПАДЗЯКУ ГА “Брэсцкі абласны цэнтр падтрымкі грамадзянскіх ініцыятыў “ВЕЖА” ЗА ТЭХНІЧНУЮ ДАПАМОГУ

**Заснавальнік** - Ініцыятыўная група моладзі.

**Распаўсюджваецца бясплатна** на правах унутранага карыстання

**Падпісана ў друк** 18.03.2002 года ў 18-00

**Наклад** 299 асобнікаў.

**Галоўны рэдактар:** Д.Шыманскі

**Рэдакцыйная калегія:** Я.Берасцейская, Д.Раманоўская, А.Дземідзюк

**Кантактны тэлефон:** (0162) 26-15-51

**E-mail:** dzedzich@mail.ru